Да сустрэчы, «Славянскі базар»!

СТАР. 3

Бліжэй да культуры Паднябеснай

СТАР. 5

Нараджаць ці не нараджаць?

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 ЛІПЕНЯ 2016 г. СЕРАДА № 138 (28248)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПРАЦАВАЦЬ НА СТВАРЭННЕ РАЗАМ

Беларусь і Расія з развалам СССР страцілі сістэму, падобнай да якой не было ў свеце. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы са старшынёй фракцыі Камуністычнай партыі Расійскай Федэрацыі ў Дзяржаўнай думе Генадзем Зюганавым, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.

«Мы страцілі краіну, але самае страшнае, што мы страцілі сістэму, якую стваралі за дзесяцігоддзі і падобнай да якой не было ў свеце, якую трэба было шліфаваць, дапрацаваць — і мы былі б зусім іншай дзяржавай нават пры развале Савецкага Саюза, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І сёння астаткі гэтай сістэмы, якую трэба было б, відаць, захаваць, мы пачынаем дабіваць, асабліва ў эканоміцы, асабліва ў сацыяльна-эканамічным развіцці».

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што некаторыя праблемныя моманты застаюцца ва ўзаемаадносінах Беларусі і Расіі. «Хоць мы і рушылі наперад далей за ўсіх у нашых адносінах, ёсць нюансы, якія насцярожваюць нас, кіраўніцтва краіны, і вельмі крыўдзяць людзей», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Генадзь Зюганаў згадзіўся з меркаваннем Прэзідэнта Беларусі адносна распаду СССР. «Мы былі б ужо наперадзе планеты ўсёй. А цяпер дажылі да таго, што нас ледзь не спрабуюць выставіць з Алімпійскіх гульняў», — дадаў лідар КПРФ.

* * *

Аляксандр Лукашэнка ўручыў старшыні фракцыі Камуністычнай партыі Расійскай Федэрацыі ў Дзяржаўнай думе Генадзю Зюганаву ордэн Дружбы народаў.

«Столькі, колькі робіце вы ў Расіі, гэта не для ліслівасці сказана, ніхто не рабіў і не робіць, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да лідара КПРФ. — Мы ўзнагародзілі вас не да выбараў, а даўно. Проста ў нас не было выпадку, каб я асабіста вам уручыў гэту ўзнагароду».

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што Камуністычная партыя — самая блізкая да народа. «Я вельмі рады, што кіраўніцтва Расіі нарэшце зразумела, што Кампартыя — гэта партыя не развалу, не процістаяння, не рэвалюцыі і вайны, а што гэта партыя нацэлена на стварэнне», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Генадзь Зюганаў удастоены ўзнагароды за значны асабісты ўклад ва ўмацаванне дружалюбных адносін і супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй, станаўленне Саюзнай дзяржавы, развіццё эканамічных, навукова-тэхнічных і культурных сувязяў.

УСІМ ЛЫЖКАМ ЛЫЖКІ

Сваімі драўлянымі лыжкамі жыхар гарадскога пасёлка Івянец Афанасій Кондрыкаў заняўся дзесяць гадоў таму. Сёння майстру восемдзесят два! Ні дня ён не праводзіць без справы, майструе граблі, тапарышчы, робіць і бондарскія рэчы — бочкі і драўляныя вёдры. Свой асартымент прадае на мясцовым кірмашы: сёння такія вырабы, акрамя Кондрыкава, ніхто не робіць. Асабліва Афанасій Фядосавіч любіць паваждацца з ліпавымі лыжкамі. Да таго ж, гаспадарлівыя івянчучкі любяць іх — такімі лыжкамі зручна памешваць варэнне, грыбы, чэрпаць мёд.

— Чаму я адрадзіў лыжкарства? — перапытвае івянецкі майстар. — Аднойчы гатаваў сіроп для пчол, а спецыяльнай прылады для памешвання не было. Тады ўспомніў свайго бацьку — ён быў здольны спецыяліст па дрэве. Узяў ліпавую цурку і выразаў вялікую лыжку. Адтуль і пайшло маё захапленне.

Анатоль КЛЯШЧУК, Фота аўтара.

Івянецкі лыжкар Афанасій Кондрыкаў і пяцігадовая мінчанка Вера Дзяйкова — іх здружыла самаробная лыжка.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр КАНЮК, генеральны пракурор:

«Нявыплата зарплаты — вельмі сур'ёзнае пытанне, якое мы пастаянна трымаем у полі зроку. Наколькі я ведаю, стан спраў палепшыўся ў гэтых адносінах, але тым не менш з кантролю гэтая тэма не здымаецца. Гэта сацыяльна значная праблема, і яна ўвесь час пад увагай. Адзначу, што ў ліку актуальных цяпер пытанняў і праблемы неразлікаў паміж прадпрыемствамі. Унутраная і знешняя дэбіторская запазычанасць — гэта прыярытэтныя пытанні ў эканоміцы, пра якія гаворыць Прэзідэнт, і пракуратура спецыяльна гэтым займаецца».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.07.2016 г.

Долар ЗША		1,9776 ▼
Еўра		2,1879 ▼
Рас. руб.		0,0313 ▼
Укр. грыўня		0,0797 ▼

■ Парламенцкі дзённік

ЯПОНСКІЯ ІНВЕСТАРЫ ХОЧУЦЬ ПРЫЙСЦІ Ў БЕЛАРУСЬ

Паводле слоў дэпутата Палаты прадстаўнікоў, кіраўніка групы дружбы «Японія — Беларусь» парламента Японіі Гэньіціра САТА, Японія спадзяецца на развіццё супрацоўніцтва з нашай краінай у сферы інфармацыйных тэхналогій.

«Наколькі мне вядома, Прэзідэнт і ўрад Беларусі прыкладаюць вялікія намаганні для развіцця ў гэтай галіне. Мы спадзяёмся на далейшае супрацоўніцтва і на прыход японскіх інвестараў у вашу краіну», — адзначыў Гэньіціра Сата.

Ён таксама падкрэсліў, што ў Беларусі эфектыўна працуе шэраг вядомых японскіх кампаній і парламентарыі зацікаўлены ў павелічэнні іх колькасці для ўзаемавыгаднай кааперацыі.

Акрамя таго, падчас сустрэчы японскай дэлегацыі з **намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Віктарам ГУМІНСКІМ** бакі абмеркавалі пытанні міжпарламенцкага супрацоўніцтва, узаемадзеяння на міжнароднай арэне. Асаблівую ўвагу парламентарыі ўдзялілі абмеркаванню кааперацыі ў гуманітарнай сферы і абмену інфармацыяй у галіне ядзернай бяспекі і ліквідацыі наступстваў трагедый на Чарнобыльскай АЭС і Фукусіме-1.

«Падзеі пяцігадовай даўнасці, звязаныя з аварыяй на станцыі Фукусіма-1, — гэта трагедыя, якая збліжае нашы народы для таго, каб мы рабілі ўсё магчымае для прадухілення яе наступстваў і не дапускалі падобнага ў будучыні», — падкрэсліў Віктар Гумінскі.

Гэньіціра Сата ў сваю чаргу адзначыў, што чакаецца прыезд групы дзяцей з прэфектуры Фукусіма ў Беларусь і падзякаваў прадстаўнікам нашай краіны за такую магчымасць.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Сардэчна запрашаем

ПОЛАЦК КОЖНАГА ЗДОЛЬНЫ ЗДЗІВІЦЬ,

але наколькі поўна мы выкарыстоўваем турыстычны патэнцыял нашай краіны?

Калі вы думаеце, што Сафійскі сабор і Спаса-Еўфраіннеўскі манастыр — гэта ўсё, што можна паглядзець у Полацку, то вельмі памыляецеся. У гэтым невялікім па сённяшніх мерках гарадку з насельніцтвам у 85 тысяч чалавек — звыш 150 помнікаў культуры! Такое багацце скульптур, сабораў, музеяў і мемарыяльных комплексаў не здольна пакінуць абыякавым ніводнага турыста. Але наколькі выкарыстоўваецца гэты багаты патэнцыял? Што можа даць Полацк сваім гасцям, што мы маем сёння ў цэлым у краіне ад турыстычных паслуг і што можна было б мець?

Гэтыя пытанні былі ўзняты на выязным пасяджэнні міжведамаснага экспертна-каардынацыйнага савета па турызме пры Савеце Міністраў, якое прайшло ў самым старажытным горадзе краіны.

Што тычыцца непасрэдна Полацка, то ён усё яшчэ здольны здзіўляць нават спецыялістаў. Так, у Спаса-Праабражэнскай царкве ўсяго некалькі тыдняў таму пры рэканструкцыі пад слаямі алейнай фарбы былі знойдзены новыя фрэскі. Над імі цяпер працуюць беларускія і расійскія рэстаўратары. Спецыялісты Міністэрства культуры кажуць, што зараз распрацоўваецца і рыхтуецца дакументацыя па ўключэнні гэтай царквы ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

— Але нават тут мы ўбачылі шэраг аб'ектаў, якія даўно не эксплуатуюцца, — гаворыць **намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА.** — І ў цэлым доля турыстычных паслуг у ВУП сёння невялікая. Але ж экспарт паслуг, у тым ліку і турыстычных, — адзін з прыярытэтных напрамкаў развіцця нашай краіны. Прынята дзяржаўная праграма «Беларусь гасцінная» на 2016—2020 гады, у якой прадугледжаны мерапрыемствы і фінансаванне, накіраваныя на тое, каб паказаць усе магчымасці нашай краіны для гасцей і турыстаў, якія прыязджаюць да нас. Зрухі ўжо адбыліся, але наш патэнцыял дазваляе зарабляць на турызме ў разы больш.

СТАР. 3

Фота БЕЛТА.

■ Лад жыцця

ТЭРЫТОРЫЯ ЗДАРОЎЯ Ў ПЫШКАХ

Для ўсіх ахвотных і ў любую пару года

У Гродне ёсць месца, дзе «рабочы дзень» пачынаецца, як толькі развіднела, і доўжыцца да позняга вечара. Штодзённа, без выхадных, у любую пару года, а асабліва вясной і летам. Гэта — лесапарк Пышкі, унікальны прыродны масіў у межах горада, літаральна побач не толькі з Нёманам, але і з сучаснай інфраструктурай абласнога цэнтра.

«Малайчына!»

Адна з цікавінак лесапарку Пышкі — сцяжына здароўя. Многія гродзенцы ўжо прызвычаіліся выконваць тут штодзённую норму пешаходнага альбо бегавога кіламетражу. Прычым адразу заўважаеш, што такое жаданне ёсць у людзей самага рознага ўзросту, у тым ліку ў моладзі і пенсіянераў. Хтосьці ходзіць альбо бегае адзін, іншыя — сямейнай парай, у кампаніі з сябрамі і сусядзямі. Ва ўжо ўстаноўленым рэжыме часу альбо тады, калі мае магчымасць. Усё больш папулярнай становіцца скандынаўская хадзьба — з дапамогай спецыяльных палак, якія падобныя на лыжныя. У гродзенскай цэнтральнай гарадской паліклініцы нават адкрылі групу для заняткаў па гэтай методыцы, якая станоўча ўплывае на работу сардэчна-сасудзістай, дыхальнай, імуннай сістэм, суставаў і мышцаў. Абмежаванняў па ўзросце для скандынаўскай хадзьбы няма.

СТАР. 5

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Пры авіяўдары ў раёне Алепа загінулі мірныя жыхары

У ходзе бамбардзіровак амерыканскіх ВПС і іх саюзнікаў у раёне Алепа ў Сірыі 19 ліпеня загінулі 56 мірных жыхароў, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на прадстаўніка Сірыйскага савета па наглядзе за правамі чалавека, які базуецца ў Вялікабрытаніі. У ходзе авіяўдараў у раёне вёскі Аль-Тухар каля горада Манбідж бомбы патрапілі ў групу мірных жыхароў, якія спрабавалі пакінуць раён баявых дзеянняў. Сярод тых, хто загінуў, 11 — дзеці.

Расіян, якія падумваюць эмігрыраваць, стала больш

Эмігрыраваць з Расіі хоча амаль кожны пяты расіянін (19%). Такія вынікі апытання, праведзенага «Лявада-Цэнтрам». Яшчэ 25% грамадзян задумваліся пра эміграцыю. Колькасць расіян, якія жадаюць з'ехаць за мяжу, вырасла з сакавіка 2015 года. У якасці прычыны, якая прымушае іх думаць пра ад'езд з краіны, рэспандэнты часцей за ўсё называюць «лепшыя ўмовы жыцця за мяжой». На другім месцы — «нестабільная эканамічная сітуацыя ў Расіі», на трэцім — «жаданне забяспечыць дзецям годную і надзейную будучыню». Пры гэтым 73% расіян ніколі не думалі пра ад'езд. Сацыёлагі лічаць павелічэнне долі ахвотных эмігрыраваць расіян «недастаткова вялікім, каб гаварыць пра істотную змену настрояў у грамадстве». На іх думку, звесткі даследавання адлюстроўваюць не рэальнае жаданне пэўных груп грамадзян з'ехаць, але іх незадаволенасць сітуацыяй у краіне, якая ў лепшы бок пакуль не мяняецца.

ВМФ Турцыі пасля путчу недалічыўся 14 караблёў

Пасля спробы ваеннага перавароту ў Турцыі ВМФ краіны недалічыўся 14 ваенных караблёў: яны не выходзяць на сувязь, паведамляе брытанская газета The Times. Лёс камандуючага турэцкім флотам Вейселя Кезеле таксама невядомы. Няма ніякіх звестак адносна таго, ці быў ён адным з удзельнікаў мяцяжу ці знаходзіцца ў палоне ў путчыстаў, адзначае выданне. Да спробы перавароту караблі знаходзіліся на баявым дзяжурстве ў Эгейскім і Чорным морах. Адсутнасць сувязі караблёў з ваенна-марскім штабам выклікала здагадку, што некаторыя судны могуць накіравацца ў грэчаскія порты. Як паведамлялася раней, пасля правалу спробы перавароту восем турэцкіх афіцэраў папрасілі прыстанішча ў Грэцыі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Зніжэнне вагі выратуе ад раку і дыябету

Зніжэнне вагі пацыента адыгрывае ключавую ролю пры шматлікіх захворваннях, у тым ліку на рак і дыябет. Як перадае Inquisitr, нядаўна навукоўцы высветлілі: зніжэнне вагі прыводзіць да падзення ўзроўню бялкоў, звязаных з ракам. Гэтыя бялкі ўдзельнічаюць у ангіагенезе — фарміраванні новых сасудаў. А гэта важна для росту і размнажэння ракавых клетак. Атрымліваецца небяспечная схема: чалавек мала рухаецца, няправільна харчуецца, і ў яго развіваецца атлусценне. А, як вядома, атлусценне разам з сядзячым спосабам жыцця пагражае захворваннем на рак. І ў гэтым выпадку рак будзе развівацца вельмі актыўна менавіта з-за наяўнасці лішняй вагі ў чалавека. Назіранні паказалі: чым больш чалавек скідаў кілаграмаў, тым ніжэй станавілася канцэнтрацыя гэтых бялкоў. Такім чынам, памяншэнне вагі прыводзіла да скарачэння рызыкі раку грудзей, кішэчніка і прастаты на 20%.

КОРАТКА

«З 1 жніўня 2016 года пры правядзенні плацяжоў наяўнымі грашовымі сродкамі ў беларускіх рублях праз касы банка будзе брацца плата ў памеры BYN1 пры кожным звароце кліента незалежна ад колькасці плацяжоў. Пры правядзенні аналагічных плацяжоў з банкаўскай плацежнай карты ў касе банка гэта камісія брацца не будзе», — растлумачылі ў Беларусбанку. У прэс-службе адзначылі, што такая плата таксама не будзе брацца з ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, пры ажыццяўленні плацяжоў у бюджэт, пры выкананні абавязацельстваў перад банкам (пагашэнне крэдытаў, плацяжы за паслугі банка), з плацяжоў і залічэнняў на дабрачынныя рахункі, з залічэнняў на рахункі фізічных асоб, адкрытыя ў Беларусбанку.

Энергазабеспячэнне адноўлена пасля навальнічнага фронту ва ўсіх населеных пунктах Беларусі, а Беларускае рэспубліканскае ўнітарнае страхавое прадпрыемства «Белдзяржстрах» выплаціла ўжо амаль BYN150 тыс. пацярпелым ад ураганаў 11-13 ліпеня.

■ Сітуацыя

ТРУБА СУПРАЦЬСТАЯННЯ

Чаму гараджане не заўсёды рады капітальнаму рамонту

Канфлікт разгарэўся ў доме №6 па Віцебскім праспекце г. Магілёва. Дом — тыповая хрушчоўка 1961 года пабудовы, дзе кухня 5 «квадратаў», цесны сумешчаны санвузел і калідор такі, што двум чалавекам не размінуцца. Капрамонту, кажуць жыхары, не было ў ім за ўвесь перыяд існавання. Летась, нарэшце, дайшла чарга і да гэтага дома, але перамены не для ўсіх сталі прыемнымі.

Праектам прадугледжана замена сістэм ацяплення, труб халоднага водазабеспячэння і каналізацыі. І калі з ацяпленнем пытанняў не ўзнікла, то па каналізацыі яны ёсць. Справа ў тым, што па старым праекце каналізацыйная труба лічылася агульнай для дзвюх суседніх кватэр. Для гэтага ў адной з кватэр маецца ніша. Паводле новых правілаў, труба павінна з'явіцца яшчэ і ў той кватэры, дзе яе не было. А гэта значыць, што і без таго маленькі санвузел стане яшчэ больш цесным.

Вячаслаў Астапаў і яго суседзі паверхам ніжэй лічаць, што іх правы ўшчамляюцца.

Кватэры ў іх прыватызаваныя, яны плацілі за прыватызацыю з улікам тых самых сантыметраў, якія зараз у іх збіраюцца забраць. «Плошча нашых санвузлоў паменшае на 100 квадратных сантыметраў. Для памяшкання агульнай плошчай 2,87 метра гэта адчувальна», — тлумачыць Дзяніс Жукаў.

СТАР. 3

Суседзі падтрымліваюць адзін аднаго.

ISSN 1990 - 763X

■ Ва ўрадзе

ЗАМЕНА ІМПАРТУ

Работа па імпартазамяшчэнні ў краіне мае сістэмны характар на працягу многіх гадоў. Паводле слоў прэм'ер-міністра Андрэя КАБЯКОВА, доля імпартазамяшчальнай прадукцыі ў прамысловасці дасягнула 27,9%. За апошнюю пяцігодку такой прадукцыі выраблена на суму каля 70 млрд долараў.

Фота БЕЛТА.

Кіраўнік урада адзначыў, што ва ўмовах адкрытасці нацыянальнай эканомікі выпуск якаснай імпартазамяшчальнай прадукцыі дазваляе задавальняць унутраны попыт і экспартаваць канкурэнтныя тавары за мяжу.

Прэм'ер-міністр нагадаў, што ўстаноўленыя канкрэтныя патрабаванні да вытворчасці імпартазамяшчальнай прадукцыі сёлета. Прырост такіх тавараў павінен скласці не менш за 600 млн долараў. Пры гэтым пастаўлена задача прыцягнуць да выпуску імпартазамяшчальнай прадукцыі малы і сярэдні бізнес.

«Хачу асабліва падкрэсліць, што, кажучы аб імпартазамяшчэнні, мы вядзём гаворку не толькі аб буйных прадпрыемствах. Часта замясціць імпарт не вельмі складаных у вытворчасці тавараў значна прасцей невялікім кампаніям, якія мабільныя і лепш адчуваюць, у якой прадукцыі спажывец мае патрэбу», — растлумачыў Андрэй Кабякоў. Паводле яго слоў, прадпрымальнікі здольныя стварыць сетку па прасоўванні айчынных тавараў не толькі ў лёгкай прамысловасці, але і ў іншых галінах.

Акрамя таго, прэм'ер-міністр падкрэсліў, што ў Беларусі рэалізуецца эфектыўная сістэма па абароне ўнутранага рынку. У першую чаргу гаворка ідзе аб спыненні гандлю кантрафактнымі таварамі лёгкай прамысловасці. Для прадпрымальнікаў дзейнічае забарона на гандаль без сертыфікатаў і суправаджальных дакументаў, наладжаны кантроль за выкананнем тэхрэгламентаў, праводзяцца сістэмныя праверкі. Устаноўлена неабходнасць праходжання імпарцёрамі санітарна-гігіенічнай экспертызы па асобных таварах. Як адзначыў Андрэй Кабякоў, усё гэта робіцца для забеспячэння законнай абароны правоў спажыўцоў на набыццё якаснага тавару.

Таксама прэм'ер-міністр падкрэсліў, што ад створанага па рашэнні кіраўніка дзяржавы новага антыманапольнага ведамства — Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю — чакаюцца пэўныя вынікі, у тым ліку ў пытаннях абароны ўнутранага рынку.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Выбары-2016

Нацыянальных назіральнікаў — 376

Па апошніх звестках, выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу шостага скліканя акрэдытавалі 376 назіральнікаў. Адпаведная інфармацыя размешчана на сайце Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Так, 35 з гэтай колькасці — грамадзяне, якія падалі заявы самастойна. Ад працоўных калектываў накіраваны 2 чалавекі. Ад палітычных партый — 34 назіральнікі, з якіх 29 — ад Камуністычнай партыі Беларусі, 2 — Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, па адным — ад Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі, Ліберальна-дэмакратычнай і Партыі БНФ.

Абсалютная большасць нацыянальных назіральнікаў зарэгістравана ад грамадскіх аб'яднанняў — 305. Па 60 ад «Белай Русі» і Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, 43 — Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, 30 — Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, 21 — Беларускага саюза жанчын, 1 — БНФ «Адраджэнне» і 90 — ад іншых грамадскіх аб'яднанняў.

Што тычыцца міжнародных назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў, то іх акрэдытавана 48. Ад Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў-удзельніц СНД — 8.

Таксама на сайце з'явілася інфармацыя аб чатырох вылучаных кандыдатах у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у Гомельскай і Мінскай абласцях, а таксама ў горадзе Мінску. Трое з іх вылучаліся ад працоўных калектываў, адзін (са сталіцы) — у тым ліку шляхам збору подпісаў.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Сустрэчы

Дапаўняць адно аднаго

Старшыня КПРФ Генадзь Зюганаў пасля ўзнагароджання ордэнам Дружбы народаў правёў адмысловую прэс-канферэнцыю, лейтматывам якой гучала пытанне інтэграцыі Расіі і Беларусі.

— Лёс адмераў Расіі найвялікшыя запасы энерганосьбітаў, — разважае Генадзь Зюганаў. — А ў Беларусі ёсць добра развітыя галіны эканомікі, сярод якіх вылучаюцца машынабудаванне і сельская гаспадарка. Чаму б не скарыстацца гэтым і не дапаўняць адно аднаго? Можна ж атрымаць на выхадзе цудоўны вынік і вырашыць многія праблемы. Менавіта аб гэтым трэба думаць пабольш, а не аб разнастайных спрэчках. Лепш сесці за стол перамоў і вырашыць усе канфліктныя пытанні.

Асобна Генадзь Зюганаў закрануў тэму стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза. На думку лідара КПРФ, гэта важны крок да суверэнітэту, незалежнасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі краін, якія ўваходзяць у гэтую структуру.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

Дыялог працягваецца

Задаць свае пытанні можна кожную суботу з 9 раніцы да паўдня. Па традыцыі, на званкі адказваюць старшыні гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, іх намеснікі і кіраўнікі спраў.

Такую форму працы са зваротамі сталі практыкаваць у пачатку 2015 года. За гэты час тэлефонны званок стаў сапраўдным гарантам рашэння любой праблемы.

У гэтую суботу, 23 ліпеня, на сувязь з жыхарамі краіны выйдуць:

Брэсцкі аблвыканкам
намеснік старшыні КЛЕЦ Андрэй Анатолевіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
кіраўнік спраў СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
намеснік старшыні БУБЕНЧЫК Алена Аляксандраўна (80152735644);

Магілёўскі аблвыканкам
намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васілевіч (80222501869);

Мінскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);

Мінскі гарвыканкам
кіраўнік спраў Котаў Мікалай Аляксандравіч (80172224444).

■ Слова — дэлегату Народнага сходу

АДКАЗНАСЦЬ, СУМЛЕННАСЦЬ І ТЭХНАЛАГІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ

На думку галоўнага рэдактара газеты «Гродзенская праўда», дэлегата V Усебеларускага народнага сходу Паўла СУХАРУКАВА, гэта галоўныя прыярытэты ў рабоце сродкаў масавай інфармацыі. На Гродзеншчыне імкнуцца асвойваць новыя магчымасці дзеля высокага ўзроўню інфармацыйнага ўплыву ў рэгіёне, упершыню ў краіне стварыўшы на абласным узроўні медыйны кластар друкаваных СМІ.

— Інфармаванне насельніцтва і фарміраванне грамадскай свядомасці з'яўляюцца асноўнымі функцыямі сродкаў масавай інфармацыі. У абласных і раённых газет у гэтым працэсе — свае асаблівыя месца і роля. Як паказваюць статыстыка і сацыялагічныя даследаванні, рэгіянальныя СМІ карыстаюцца папулярнасцю і маюць высокі аўтарытэт сярод сваіх чытачоў. У прыватнасці, нягледзячы на агульную тэндэнцыю росту папулярнасці электронных СМІ, наша газета не толькі захоўвае, але і павялічвае тыраж друкаванай версіі.

Творчы патэнцыял рэгіянальных рэдакцый сёння дазваляе эфектыўна выкарыстоўваць усе магчымасці, што маюцца ў распараджэнні, і аператыўна асвойваць новыя. Што тычыцца творчай планкі «Гродзенскай праўды», — аб ёй сведчаць пяць дыпломаў лаўрэата рэспубліканскага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Літара», атрыманыя намі за тры апошнія гады.

Але мы бачым і праблемы, выклікі часу, стараемся своечасова на іх рэагаваць. Адзін з іх — падтрыманне высокага ўзроўню інфармацыйнага ўплыву ў рэгіёне. Гэта асабліва актуальна на Гродзеншчыне, у памежжы, дзе перасякаюцца інфармацыйныя патокі, часта звонку, не толькі не лаяльныя, але і яўна варожыя палітыцы нашай дзяржавы. Таму вельмі важна захоўваць інфармацыйнае лідарства.

На сённяшні дзень гэта немагчыма без пастаяннага тэхнічнага пераўзбраення і актыўнай прысутнасці ў глабальным сеціве. Мы ўвесь час нарошчваем свой тэхнічны патэнцыял, набываючы сучаснае абсталяванне, якое ў тым ліку дазваляе журналістам працаваць дыстанцыйна, што істотна скарачае час паступлення інфармацыі да чытача. Летась кардынальна мадэрнізавалі наш інтэрнэт-рэсурс. Маем такую магчымасць, будучы гасразліковым прадпрыемствам, валодаючы неабходнымі рэсурсамі і карыстаючыся падтрымкай арганаў улады.

Сур'ёзнай эксперыментальнай пляцоўкай па прасоўванні рэгіянальнай прэсы ў глабальным сеціве з'яўляецца медыйны кластар друкаваных СМІ, які ўпершыню ў краіне створаны на абласным узроўні. Ён аб'ядноўвае аблвыканкам, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, рэдакцыі «Гродзенскай праўды» і раённых газет. У яго рамках ладзяцца навучальныя семінары, творчыя конкурсы, майстар-класы. Абмяркоўваем публікацыі, імкнёмся да больш якаснай прысутнасці рэгіянальных газет у сацыяльных сетках. Гэтай структуры ўсяго некалькі месяцаў, але пазітыўныя вынікі ёе дзейнасці чытачы, пэўна, ужо адчулі.

Важнейшай задачай па ўдасканаленні інфармацыйнага прадукту з'яўляецца падрыхтоўка для рэгіянальных газет высокапрафесійных кадраў. З гэтай мэтай на базе «Гродзенскай праўды», упершыню сярод абласных газет, стварылі філіял кафедры журналістыкі ГрДУ імя Янкі Купалы. Вопытныя журналісты праводзяць заняткі са студэнтамі, рыхтуюцца вучэбныя газеты. Такім чынам, згодна з патрабаваннямі кіраўніка дзяржавы, журналісцкая адукацыя максімальна набліжаецца да практыкі, а маладыя спецыялісты прыходзяць у рэдакцыі з пэўным вопытам рэальнай працы ў СМІ.

Ёсць і яшчэ адзін, мяркую, істотны момант у канкурэнтным асяроддзі. Рэгіянальная грамадска-палітычная газета не павінна саступаць па афармленні рэкламным і папулярным выданням. Інфармацыя, якая паступае да чытача, павінна быць візуальна прывабнай. Дзяржаўная падтрымка ў тэхнічным пераўзбраенні абласных друкарняў, набыцці і мадэрнізацыі газетных друкарскіх машын дазволіць нам выпускаць якасны інфармацыйны прадукт, які адпавядае сучасным патрабаванням.

Але галоўным, на маю думку, у рабоце нашага журналісцкага цэха былі і застаюцца сумленнасць і прыстойнасць. Як і цяпер, так і сто гадоў таму сур'ёзныя СМІ ствараліся не дзеля рэкламы і бізнесу, а дзеля ўплыву на грамадска-палітычныя працэсы ў дзяржаве, канкрэтным рэгіёне. У многім дзякуючы СМІ адбываецца дыялог улады з народам. І ад нашага прафесіяналізму, нашай адказнасці і шчырасці залежыць, наколькі эфектыўна вядзецца гэты дыялог.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

■ Узровень

У ЧЫМ САКРЭТ,

або Прагрэс дабаўляе рабочыя месцы

Рэспубліка Беларусь першай сярод краін СНД — з 1 студзеня 2015 года — перайшла на рэалізацыю на сваім рынку аўтамабільнага паліва 5-га класа, у выніку чаго нашы людзі дыхаюць больш чыстым паветрам. Гэта стала магчымым дзякуючы і намаганням калектыву Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода — тут у апошні час якасць прадукцыі выведзена на новы, больш высокі ўзровень, пачалася ўстойлівая вытворчасць аўтамабільнага паліва толькі стандарту Еўра-5. Растуць і аб'ёмы перапрацоўкі. Як ні трывіяльна гучыць, але сакрэт — у пастаяннай мадэрнізацыі вытворчасці і асваенні найноўшых тэхналогій.

Фота Ігара МАЛАШЧАНКІ.

Падчас прэс-тура.

Чарговыя крокі дазволіла зрабіць ажыццяўленне праграмы развіцця на 2011—2015 гады, цяпер яна выконваецца з перспектывай да 2020 года. Наколькі сур'ёзныя мерапрыемствы рэалізуюцца ў рамках такіх праграм, гаворыць лічба: агульны кошт уведзеных у эксплуатацыю за апошнія дзесяць гадоў тэхналагічных аб'ектаў складае больш за мільярд долараў ЗША.

Навукова-тэхнічны прагрэс застаецца прыярытэтным напрамкам. Сёлета на працягу першага паўгоддзя завершана ўзвядзенне трох новых вытворчых аб'ектаў агульным коштам 500 мільёнаў долараў.

Асобна варта сказаць, што ў стадыі рэалізацыі знаходзіцца маштабны інвестыцыйны праект «Будаўніцтва комплексу гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых рэшткаў», які дазволіць павысіць глыбіню перапрацоўкі нафты да 90%. Гэтаму аб'екту асаблівае значэнне надае ўрад краіны — у мінулую суботу пасяджэнне штаба будоўлі правёў намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Уладзімір Сямашка.

Значнасць праекта яшчэ і ў тым, што адчувальна — больш чым на 800 тысяч тон — павялічыцца выпуск дызельнага паліва з колькасцю серы ўсяго ў 0,001%. Якасць кацельнага паліва — мазуту — будзе адпавядаць найноўшым еўрапейскім стандартам (колькасць серы не больш 1%), а вытворчасць гідраачышчанага вакуумнага газойлю ўзрасце на 900 тыс. тон.

16 ліпеня на адкрытае акцыянернае таварыства «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод» быў арганізаваны прэс-тур, падчас якога прадстаўнікі беларускіх СМІ пабывалі на шэрагу вытворчых комплексаў, што працуюць па найноўшых тэхналогіях. Менавіта такія тэхналогіі дазваляюць, па словах генеральнага дырэктара аб'яднання Анатоля Купрыянава, наблізіцца да самых лепшых сучасных прадпрыемстваў свету.

У ходзе прэс-тура на пытанні журналістаў адказвалі намеснік генеральнага дырэктара прапрыемства па ідэалагічнай рабоце, персаналe і сацыяльным развіцці Генадзь Цецярук, дырэктар дырэкцыі па рэканструкцыі і развіцці Вадзім Данілевіч, начальнік новай камбінаванай установкі вытворчасці высокаактанавых кампанентаў бензіну Аляксей Іваноў, спецыялісты і рабочыя МНПЗ. Між іншым, Генадзь Цецярук палічыў неабходным падкрэсліць: дзякуючы ўзвядзенню новых установак на прадпрыемстве створана амаль сто новых рабочых месцаў, што для Мазыра важна. А да канца года дабавяцца яшчэ сто дваццаць.

Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ

■ Летні турызм

УСЁ ЧАСЦЕЙ АДПАЧЫВАЕМ НА РАДЗІМЕ —

пешшу, на конях, веласіпедах і байдарках

Замест замежных вандровак беларусы апошнім часам з задавальненнем адпраўляюцца ў культурныя, спартыўныя і рэлігійныя экскурсіі па краіне. Іншаземныя турысты ў сваю чаргу ўдвая актыўней наведваюць Белавежскую пушчу ў межах бязвізавага трохдзённага падарожжа.

На карпаратывы і ў паломніцтва

У Беларусі існуе каля 1,5 тысячы турысцка-экскурсійных маршрутаў на любы густ, у тым ліку і з актыўным спосабам перамяшчэння. Для наведвання прапануецца да 5000 аб'ектаў гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны. Самы прыярытэтны — культурна-пазнавальны турызм. Значнае месца ў турыстычных вандроўках займаюць экскурсійныя праграмы для школьнікаў і карпаратыўных груп. Карыстаюцца попытам паслугі, што прапаноўваюцца ў нацыянальных парках і на ахоўваемых прыродных тэрыторыях. Ёсць турфірмы, якія нават спецыялізуюцца на пэўных відах падарожжаў: водных, пешых, веласіпедных паходах, конных вандроўках, маюць для гэтага адпаведныя рыштунак і вопыт.

— Вялікую цікавасць выклікаюць экскурсіі па мясцінах жыцця нашых знакамітых суайчыннікаў. Такі напрамак падарожжаў характэрны для кампаній, што працуюць перш за ўсё са школьнікамі і моладдзю, — адзначыла **Марына МАСТАШОВА, кансультант аддзела планавання і арганізацыі турысцкай дзейнасці Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.** — Асабліве месца ў экскурсіях займае ваенна-гістарычная тэматыка. А ў апошнія гады ўсё большай папулярнасцю ў замежных турыстаў і карпаратыўных груп выклікае рэлігійная тэматыка і паломніцтвы. Шмат карпаратыўных наведванняў аграсядзіб, якіх у нас каля 2,5 тысячы. Знаёмствам з цікавымі архітэктурнымі комплексамі вызначаюць экскурсіі ў вёску Камаі ў Віцебскай вобласці, Гродна, Пінск, Косава, Ружаны. Пастаянна з'яўляюцца новыя маршруты, старыя мадэрнізуюцца і дапаўняюцца.

Геаграфія турыстычнай Беларусі таксама пашыраецца. Прывабнымі для наведвання становяцца не толькі сталіца і абласныя цэнтры, а і шэраг малых і сярэдніх гарадоў пасля ўпарадкавання і рэстаўрацыі аб'ектаў у іх.

Сумесна з Расіяй і Кітаем

Самыя шматлікія замежныя наведвальнікі Беларусі — расіяне (больш за 60% усіх уязных турыстаў) і ўкраінцы. Любяць гасцяваць у нас таксама падарожнікі з Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Літвы, Латвіі, Польшчы, Францыі і Кітая. КНР, дарэчы, разам з Турцыяй увайшла ў дзясятку краін, турысты з якіх любяць наведваць Беларусь. Пры гэтым, як адзначаюць у Дэпартаменце па турызме, іх прываблівае не толькі аграгурызм, але і магчымасць актыўнага мясцовага адпачынку: вандроўкі па экалагічных сцежках, сплавы на байдарках і іншае. У пэўнай ступені гэтаму пасадзейнічала лібералізацыя візавага рэжыму паміж краінамі. Цяпер узгадняецца спіс фірмаў, што будуць мець права вазіць без віз у Беларусь кітайскіх турыстаў і адпраўляць у вандроўкі па КНР нашых суайчыннікаў.

У межах праграмы «Беларусь гасцінная» Міністэрства спорту і турызму праводзіць пераарыентацыю на іншыя турыстычныя рынкі і робіць стаўку на сумесную працу з расійскім бокам.

— У Расіі праходзіць ваенна-патрыятычная акцыя «Шляхамі Перамогі», падчас якой турысты наведваюць мясціны, звязаныя з Вялікай Айчыннай. У межах супрацоўніцтва з федэральным агенцтвам мы плануем, што іх маршруты пройдуць і па знакавых аб'ектах у нашай краіне: Брэсцкай крэпасці, Хатыні і іншых, — заўважыла **Наталля ЕЛІСЕЕВА, намеснік дырэктара — начальнік аддзела планавання і арганізацыі турысцкай дзейнасці Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.** — Для прапаганды нашых магчымасцяў мы ездзілі з выстаўкай у Ізраіль, адкуль, дарэчы, пасля адмены віз прыток турыстаў павялічыўся ў 1,5 раза. З гэтай жа мэтай прадстаўнікі нашых санаторыяў выязджалі на выстаўку ў Азербайджан, бралі ўдзел у выстаўцы ў Пекіне. На другое паўгоддзе запланаваны азнаямляльныя туры ў Францыю і Германію.

Аўтобусам — у Італію, самалётам — у Львоў

Асаблівасць сёлетняга сезона — у практычна поўнай адсутнасці ранняга браніравання. Беларусы вырашылі перачакаць перыяд да дэнамінацыі і паназіраць за змяненнем цэн на рынку турпаслуг. Тым не менш выязному сезону быць, адзначылі ў Дэпартаменце.

Айчынныя турысты для замежных падарожжаў таксама перш за ўсё разглядаюць Расію. На другім месцы па папулярнасці была Турцыя — да спробы ваеннага перавароту ў краіне. У сувязі з гэтымі падзеямі турыстычныя аператары абяцалі поўнасцю вярнуць грошы ўсім, у каго да вылету заставаўся тыдзень. «Астатнія будуць дамаўляцца з аператарамі індывідуальна, аднак, каб захаваць свой імідж, наўрад ці кампаніі пойдуць на канфлікт», — пракаментавала супрацоўніца Дэпартамента.

Сёлета напалову знізіўся паток нашых турыстаў у Егіпет праз неспакойную сітуацыю там. Мяркуецца, што самым галоўным напрамкам пляжнага адпачынку беларусаў летам стане Балгарыя. Тым не менш аматараў сямейнага адпачынку з дзецьмі тут паменшала — гэта тлумачыцца магчымасцю дабрацца сюды толькі зусім не танным авіяшляхам. Наведвальнікі Украіны ўзімку ўжо перарыентаваліся на гарналыжныя курорты Букавеля, а цяпер масава адпачываюць у Затоцы, Адэсе і нават Львове (куды з 17 жніўня будуць арганізаваны авіярэйсы). Набываюць папулярнасць у беларусаў і аўтобусныя туры ў Іспанію і Італію.

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*.

Фота Івана КУПАРВАСА.

■ Волі не відаць

Экскаватары коштам... 9 гадоў строгага рэжыму

Плюс 2 мільярды недэнамінаваных рублёў, якія давядзецца выплаціць магіляўчаніну за зніклую на тэрыторыі Расіі тэхніку

На працягу года мужчына паспеў здзейсніць 2 злачынствы, спадзеючыся заблытаць сляды на тэрыторыі Расіі. Крымінальную дзейнасць пачаў адразу ж пасля таго, як стаў саўладальнікам таварыства з абмежаванай адказнасцю па перавозках грузаў і заняў месца яго дырэктара.

Гэтая фірма, па дагаворы з яшчэ адной, ажыццяўляла пастаўкі ў Баку тэхнікі ААТ «Амкадор». Навяспечаны кіраўнік, як той казаў, каваў жалеза, пакуль яно гарачае. Перш-наперш адхіліў ад работы вопытнага кіроўцу, які завёз у Баку першую партыю экскаватараў. Матывуючы рашэнне тым, што той стаміўся, спецыяльна наняў на працу яшчэ аднаго кіроўцу. Планавалася, што ён давязе машыны да Растова-на-Доне, а там за руль сядзе іншы чалавек. Але абставіны склаліся так, што ў Растове давялося хутка шукаць замену, каб даставіць тэхніку ў Баку. Новага кіроўцу магілёўскі прадпрымальнік наняў у Маскве, дзе якраз знаходзіўся па асабістых справах. Разам яны даехалі да Растова, пацяснулі адзін аднаму рукі і развіталіся. Як потым высветлілася, назаўсёды. Па дарозе ў Баку грузавік знік. Спачатку ён перастаў падаваць GPS-сігнал, а потым стаў недаступны і мабільны тэлефон кіроўцы. Праз нейкі час машына, на якой перавозіўся груз, знайшлася, але без экскаватараў.

Між тым кіраўнік фірмы па перавозках паспеў заключыць дамову яшчэ і па пастаўцы ў Пяцігорск Стаўрапольскага краю 20 тон сухога малака. Але яно таксама не даехала да заказчыка.

Можна было б паспачуваць няўдачліваму прадпрымальніку з Магілёва, ды страхавая кампанія, у якую ён звярнуўся, каб атрымаць вялікую суму страхоўкі за зніклае малако, западозрыла першай нядобрае. Спецыялісты знайшлі ў дакументах недакладнасці, пасля чаго дырэктарам фірмы зацікавілася міліцыя. Падчас следства высветлілася, што малако па яго ж загадзе было рэалізавана зусім іншым пакупнікам, а машына перагнана і пакінута далей ад таго месца, дзе адбылася здзелка.

Сталі вядомы і цікавыя падрабязнасці па справе аб экскаватарах. Наняты ў Расіі кіроўца скарыстаўся данымі скрадзенага пашпарта на імя жыхара Магілёва, які працяглы час ездзіў на заробкі ў суседнюю краіну.

— Зламыснік спрабаваў заблытаць сляды, гаварыў, што не вінаваты, што нават звяртаўся да расійскіх міліцыянераў, каб яны дапамаглі знайсці груз. У выпадку з экскаватарамі ў пошуках яму было адмоўлена. А вось варонежскія праваахоўнікі знайшлі толькі пустую машыну з прычэпам. Прычым у тым месцы, дзе, па словах кіроўцы, загадаў яе пакінуць дырэктар фірмы.

— Былы дырэктар валодаў шырокімі паўнамоцтвамі па ажыццяўленні кіраўніцтва прадпрыемствам, і ўсе факты паказваюць на тое, што ён наўмысна здзейсніў гэтыя злачынныя аперацыі, — рэзюмавала **старшы памочнік пракурора Магілёўскай вобласці Алена ШУМЕЙКА.**

Вось толькі на што гэты чалавек спадзяваўся, невядома. Па рашэнні суда ён атрымаў 9 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах строгага рэжыму. Акрамя гэтага, ён павінен выплаціць амаль 2 мільярды недэнамінаваных рублёў фірме, якая карысталася яго паслугамі па перавозцы, а таксама дзяржаўную пошліну ў суме больш за 95 мільёнаў недэнамінаваных рублёў.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Здарэнні

НЯЎДАЛЫ САМАГОНШЧЫК

Сюжэт, у нечым падобны да славутай кароткаметражкі Леаніда Гайдая, адбыўся днямі ў Мінску. У дзесяць гадзін раніцы пажарнікам дзелка да ратаўнікоў паступіла паведамленне пра ўспышку газу ў адным з жылых дамоў у самым цэнтры сталіцы — на завулку Калініна. Аднак ніякіх праблем з газаправодам на месцы не было.

Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, якія прыехалі на месца здарэння, высветлілі прычыну выбуху — у адной з кватэр на чацвёртым паверсе разарваўся самаробны самагонны апарат, што знаходзіўся на кухоннай пліце. Як паведамляюць у прэс-службе МНС, аскепкі пашкодзілі шкло балконнай рамы, цэласнасць канструкцыі парушана не была. Эвакуяваць жыльцоў дома не прыйшлося. Найбольш ад выбуху пацярпеў сам няўдалы самагоншчык — 56-гадовы брат гаспадыні кватэры. Гарачая вадкасць пакінула на яго плячы і перадплеччы апёкі 1 і 2 ступені, на руцэ засталіся шматлікія рэзаныя раны. Мужчына шпіталізаваны. Прычыны здарэння высвятляюцца.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

ВІЦЕБСК СТАЎ РОДНЫМ

Робат-вядучы і іншыя «зоркі» ў сталіцы «Славянскага базару»

Сёння на «Славянскім базары» ў Летнім амфітэатры позна вечарам пачнецца апошні канцэрт. Ён і стане фінішам у 9-дзённым марафоне фестывальнага дзейства.

Карэспандэнты «Звязды» ўсе гэтыя дні, а часта і ночы нешта пісалі і здымалі. А «зорныя» ўдзельнікі фэсту не скупіліся на камплімenты Віцебску і нашай краіне. Падкрэслівалі, што такога, як на «базары», больш нідзе не бачылі. Некаторыя параўноўвалі «Славянскі базар» з таксама знакамітым фэстам у Рыа-дэ-Жанэйра, дзе ў жніўні пройдуць летнія Алімпійскія гульні.

Словы са шлягера: «Горад-казка, горад-мара...» — напэўна, гэта і пра Віцебск. «Зоркі», калі сюды трапляюць упершыню, абавязкова хочуць зноў вярнуцца.

Вядучы «зорных гадзін» у прэс-цэнтры «базару» **Сяргей ШУСЦІЦКІ, вядомы журналіст і кампазітар,** лічыць сябе віцяблянінам. І мала хто з гараджан ведае, што менавіта ён — аўтар акорда фэсту, які гучыць перад пачаткам усіх «базарных» мерапрыемстваў.

— У 1999-м я напісаў гэтыя ноты. І ганаруся, што ўсе гады і сёлета яны адкрываюць усе галоўныя падзеі на «базары». Віцебск стаў мне родным горадам. Тут хочацца парадаваць гледачоў творчасцю і сустрэцца са старымі добрымі сябрамі. Мы — расійскія ўдзельнікі — удзячныя арганізатарам за найвышэйшы прафесіяналізм. А жыхарам горада — за надзвычайную гасціннасць, — сказаў ён.

Папулярны спявак Сяргей ЛАЗАРАЎ сёлета першым на «Славянскім базары» выступіў з сольным канцэртам. Яго новая шоу-праграма «The Best» публіцы вельмі спадабалася.

— 20 гадоў таму я выступаў у Летнім амфітэатры ў складзе дзіцячага калектыву. І гэта цудоўна памятаю, хоць з таго часу шмат дзе быў. Віцебск для мяне горад, які выклікае самыя станоўчыя эмоцыі, — прызнаўся спявак.

Сёлета 25-гадовы юбілей фэсту супаў з аналагічным юбілеем папулярнай арт-групы «Хор Турэцкага». На галоўнай сцэнічнай пляцоўцы «базару» спевакі прадставілі шоу «З табой назаўжды».

— Ваш цудоўны фестываль заўсёды прыцягвае. Тут прыемна бываць, выступаць. Віцебску і яго самаму вядомаму фэсту можна прысудзіць тытул чэмпіёна ў сэнсе магчымасці культурнага абмену, яднання. «Базар» — гэта «краіна», дзе правяць баль любоў і дружба, — падкрэсліў **Міхаіл ТУРЭЦКІ.**

Мэтр кіно, **расійскі рэжысёр Аляксандр ПРОШКІН,** упершыню пабываў на фэсце. Нагадаю, ён аўтар такіх папулярных кінастужак, як «Халоднае лета пяцьдзясят трэцяга...», «Міхайла Ламаносаў» і іншых.

— Раней я не быў у Віцебску, і літаральна з першых крокаў ён мяне прыемна ўразіў. А шостай гадзіне раніцы пешшу прайшоўся з вакзала. Віцебск ідэальна падыходзіць у якасці «дэкарацыі» для здымак жыцця ў горадзе, дзе ўсё добра, а гараджане шчаслівыя, — прыемна здзівіў разважаннямі майстар кінематографа.

Валерый ЛЯВОНЦЬЕЎ сёлета ўзначальваў журы конкурсу маладых выканаўцаў.

— «Славянскі базар» для мяне даўно стаў родным. Прыемна, што 25 гадоў таму я выступіў з сольным канцэртам яшчэ да яго афіцыйнага адкрыцця, — канстатаваў адзін з самых «зорных» удзельнікаў юбілейнага фэсту.

Чым яшчэ запомніцца гасцям і ўдзельнікам 25-ы «базар»? Сёлета шмат чаго тут адбылося ўпершыню.

У прыватнасці, правялі спаборніцтвы па бегу. У спартыўным мерапрыемстве бралі ўдзел і людзі з абмежаванымі магчымасцямі. Кіраўнік федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім Дзевятоўскі сказаў, што такія святы спорту трэба праводзіць пастаянна, у розных гарадах. Пасля «Славянскага забегу» ўсе, незалежна ад вынікаў, атрымалі памятныя медалі.

Упершыню правялі і ўнікальны «Вершаваны марафон». Без перапынкаў ён цягнуўся больш за 14 гадзін! І таксама быў дэмакратычным. Трэба было прачытаць верш пра Віцебск. Усяго агучылі больш за 850 вершаў! Цікава, што іх чыталі і кіраўнікі дырэкцыі «базару», і «зоркі». Гэтая акцыя ўвойдзе ў Кнігу рэкордаў фэсту, над стварэннем якой пачалі працаваць.

Фота БЕЛТА.

На «Славянскім базары» адным з вядучых стаў робат (жаночага полу). Не жартую. На свае вочы бачыў машыну на сцэне амфітэатра ў ноч з нядзелі на панядзелак. Гэта адбылося на канцэрце «EUROPA PLUS TV HIT NON STOP у Віцебску». На шоу выступілі артысты, якія вельмі падабаюцца моладзі. Любімых «зорак» аказалася так шмат, што канцэрт распачаўся каля 2 гадзін ночы, а скончыўся прыблізна ў 6.00. Таксама своеасаблівы рэкорд.

Усё самае цікавае ў адным артыкуле не асвяціць. А што на «базары» сумнае? Ды нічога! Так яно было і будзе!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Гран-пры — у беларуса Гроса!

Прадстаўнік Беларусі Аляксей Грос — уладальнік Гран-пры (і 20 тысяч долараў) конкурсу маладых выканаўцаў «Славянскага базару». Ён атрымаў у фінале ўсяго на 2 балы больш, чым Адам з Казахстана. Адрыў невялікі, і гэта — пацвярджэнне высокага ўзроўню ўсіх канкурсантаў. Журы магло не прысуджаць галоўны прыз, таму інтрыга захоўвалася да апошняга. Але на канцэрце падчас афіцыйнага закрыцця «базару» нашаму земляку ўручылі «мару ўсіх канкурсантаў» фэсту.

Фота БЕЛТА.

Першая прэмія і 15 тысяч долараў — у казахстанскага хлопца Адама.

Другую прэмію — 10 тысяч долараў — падзялілі і прысудзілі яе Элеаноры Век'ё з Італіі і Ганне Адабеску з Малдовы.

Трэцюю — 5 тысяч долараў — таксама «парэзалі». Яе атрымалі два канкурсанты: Андрэй Гвелесіані з Грузіі і Ганна Цімафей з Ізраіля.

Прэмію імя Уладзіміра Мулявіна ад Віцебскага аблвыканкама ўручылі прадстаўніку Мексікі Хорхе Рамана.

Спецыяльны прыз «Славянская надзея» Прэзідэнта Беларусі — за лепшае ўвасабленне ў творах вакальнага мастацтва славянскай тэмы — атрымала чэшская вакалістка Міхаэла Гемротава.

26-гадовы ўладальнік Гран-пры Аляксей Грос плануе патраціць грошы на творчасць. У прыватнасці, каб у рэпертуары з'явіліся шлягеры. Таксама збіраецца вось ужо чацвёрты раз паспрабаваць выйграць Нацыянальны адборачны тур «Еўрабачання». (У 2014-м, 2015-м і сёлета быў фіналістам тураў.)

Будзем спадзявацца, што перамога на «Славянскім базары» не толькі дапаможа яму прабіцца на «Еўрабачанне», але і выйграць. У гісторыі «базару» ўжо ёсць прыклады, калі былыя ўдзельнікі перамагалі на іншых фэстах.

■ Прыёмная кампанія-2016

АД БУДАЎНІКОЎ ДА ЛАГІСТАЎ

15 ліпеня ў нашай краіне распачалася прыёмная кампанія ва ўстановах, якія рыхтуюць спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Сёлета свае дзверы адчыняць для моладзі 118 каледжаў, у тым ліку 12 прыватнай формы ўласнасці, а таксама 90 установ, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Усяго на дзённую бюджэтную форму навучання плануецца прыняць 21,9 тысячы чалавек і на завочную — 2,6 тысячы. План набору на платную форму навучання (па ўсіх формах атрымання адукацыі) складае ў дзяржаўных ВНУ 11,4 тысячы чалавек. І ў прыватныя ССНУ мяркуецца прыцягнуць 4,4 тысячы навучэнцаў.

Структура прыёму захоўваецца на ўзроўні мінулых гадоў. Такія профілі адукацыі, як тэхніка і тэхналогія, архітэктура і будаўніцтва, сельская і лясная гаспадарка, у агульным прыёме складаюць больш як 50 працэнтаў.

Набор на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі будзе ажыццяўляцца па 148 спецыяльнасцях. Параўнальна новымі для гэтага ўзроўню адукацыі (прыём на іх быў распачаты ў апошнія два гады) з'яўляюцца спецыяльнасці «Абслугоўванне і эксплуатацыя жылых дамоў», «Мікра- і нанаэлектронныя тэхналогіі і сістэмы», «Электроніка механічных транспартных сродкаў», «Абсталяванне мэблевай вытворчасці», «Праграмаваныя мабільныя сістэмы», «Тэсціраванне праграмнага забеспячэння».

Упершыню будзе праводзіцца прыём на новую спецыяльнасць сярэдняй спецыяльнай адукацыі «Аперацыйная дзейнасць у лагістыцы» ў Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы лёгкай прамысловасці і комплекснай лагістыкі, а таксама ў прыватных установах адукацыі «Мінскі каледж прадпрымальніцтва» і «Баранавіцкі эканоміка-юрыдычны каледж». Пасля заканчэння навучання спецыялісты атрымаюць кваліфікацыю «аперацыйны лагіст».

Свой першы прыём ажыццявіць сёлета Мінскі гарадскі педагагічны каледж, які будзе рыхтаваць педагагічныя кадры для ўстаноў дашкольнай адукацыі і пачатковай школы. Прыём будзе праходзіць па конкурсе пасведчанняў аб агульнай базавай адукацыі. На спецыяльнасць «Пачатковая адукацыя» на дзённую форму навучання мяркуецца прыняць дзве групы па 25 чалавек, на «Дашкольную адукацыю» — адну групу такой жа колькасці. Акрамя таго, плануецца рыхтаваць педагагічныя кадры і на завочнай форме атрымання адукацыі. Пакуль што будзе набрана адна група завочнікаў, але ў далейшым іх колькасць збіраюцца павялічыць. На завочную форму навучання будуць прымацца абітурыенты з агульнай сярэдняй адукацыяй: яны будуць паступаць у каледж па выніках ЦТ па дзяржаўнай мове і біялогіі.

Прыём дакументаў на аснове агульнай базавай адукацыі будзе ажыццяўляцца за кошт сродкаў бюджэту — з 15 па 31 ліпеня, на платнай аснове — па 14 жніўня (ад абітурыентаў, якія будуць здаваць уступныя іспыты па спецыяльнасці, — па 31 ліпеня).

Уступныя іспыты пройдуць з 1 па 5 жніўня. Залічэнне на навучанне за кошт сродкаў бюджэту — па 8 жніўня, на платнай аснове — па 16 жніўня.

Прыём дакументаў на аснове агульнай сярэдняй адукацыі ці прафесійна-тэхнічнай з агульнай сярэдняй адукацыяй будзе ажыццяўляцца за кошт сродкаў бюджэту — з 15 ліпеня па 6 жніўня, на платнай аснове — па 14 жніўня (ад абітурыентаў, якія будуць здаваць уступныя іспыты па спецыяльнасці, — па 6 жніўня). Уступныя іспыты пройдуць з 7 па 9 жніўня. Залічэнне на навучанне за кошт сродкаў бюджэту — па 12 жніўня, на платнай аснове — па 16 жніўня.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ПОЛАЦК КОЖНАГА ЗДОЛЬНЫ ЗДЗІВІЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Намеснік міністра спорту і турызму Міхаіл ПАРТНОЙ бачыць галоўнай задачай стварэнне індустрыі гасціннасці, каб усюды — пачынаючы ад пагранічніка і мытніка і заканчваючы афіцыянтам у кавярні — турыста прымалі як роднага госця.

Між тым, у нашай краіне ўсё яшчэ ёсць праблемы з візавай падтрымкай, рэгістрацыяй ды і з якасцю сэрвісу таксама.

Так, працэдура рэгістрацыі сёння не вельмі зручная для тых замежных турыстаў, хто падарожнічае не ў арганізаванай групе. У аддзяленнях па грамадзянстве і міграцыі часцяком няма таблічак на англійскай мове. Усе дакументы толькі на рускай. Узнікаюць пытанні і з аплатай пошліны, якая ўносіцца праз банк — яго трэба дадаткова шукаць. Замежнаму турысту, які не валодае нашымі дзяржаўнымі мовамі, гэта можа быць цяжка.

Таму іншаземцы спыняюцца ў Беларусі ў сярэднім на 5 дзён — менавіта столькі можна знаходзіцца ў нашай краіне без рэгістрацыі турыстам з пераважнай большасці краін. У сувязі з гэтым Міхаіл Партной прапанаваў паскорыць працу над пытаннем выдачы замежнікам электронных віз у Беларусь.

Намеснік міністра спорту і турызму ўпэўнены і ў тым, што трэба зніжаць цэны на нашы гасцініцы, бо яны часам вышэйшыя, чым у суседніх краінах. Так, па стане на сярэдзіну ліпеня гэтага года кошт двухмеснага нумара ў сталічных гасцініцах («тры зоркі») пачынаўся, калі перавесці ў замежную валюту, ад 36 еўра ў гасцініцы «Арбіта» і 38 еўра ў гатэлі «Арэна-Мінск» і даходзіў да 48 еўра ў «Планеце» і вышэй у іншых гасцініцах. Пры гэтым загрузка гасцініц на сённяшні дзень складае 38,3%. «Неабходна працаваць з цэнамі», — лічыць Міхаіл Партной. А яшчэ — над такімі важнымі для любога турыста «дробязямі», як бясплатны Wi-Fi, меню на англійскай мове. Трэба, каб было больш пунктаў хуткага харчавання, паказальнікаў, банкаматаў, прыбіральняў...

— Але, каб Беларусь можна было па праве называць турыстычнай краінай, неабходна развіваць і ўнутраны турызм, — лічыць Наталля Качанава. — Не менш важна паказаць і самім беларусам усё, што ёсць у нашай краіне.

Дарэчы, калі казаць пра нашых, беларускіх турыстаў, то вельмі важна абараніць іх ад махлярства. Намеснік міністра спорту і турызму нагадаў, што такія выпадкі назіраліся ў Расіі: турфірмы бралі грошы ў людзей і знікалі, а потым аб'яўлялі аб сваім банкруцтве. Аналагічны выпадак быў і ў Беларусі на пачатку гэтага года. Кліенты, якія звярнуліся ў туркампанію «Аўрора Тур», аплацілі пуцёўкі, але на адпачынак так і не адправіліся, бо кіраўнік фірмы збегла з іх грашыма. Як лічыць Міхаіл Партной, лепш не чакаць форс-мажорных сітуацый, а заканадаўча абараніць нашых турыстаў ад такіх выпадкаў.

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

Фота БЕЛТА.

5 МЕСЦАЎ, якія варта паглядзець у Полацку

✓ Вядома ж, на першым месцы — **Сафійскі сабор.** Пабываць у Полацку і не ўбачыць гэтую вытанчаную архітэктурную жамчужыну, якая да таго ж так многа значыць для нашай гісторыі — нонсэнс. Цікава, што гэтая праваслаўная святыня, пасля таго як была ўзарвана па загадзе Пятра I, пазней была адбудавана ў стылі «віленскага барока», звычайным для касцёлаў. Сёння сабор з'яўляецца канцэртнай залай арганнай музыкі, а ў яго сутарэннях знаходзіцца экспазіцыя Музея гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора, у якой можна ўбачыць старажытны мур першапачатковага храма і многія археалагічныя знаходкі.

Дарэчы, ля сцен сабора знаходзіцца яшчэ адна з гарадскіх славутасцяў — Барысаў камень. Лічыцца, што ён выконвае запаветныя жаданні, вяртае каханне і здароўе. Для гэтага трэба загадаць жаданне, а пасля 3 разы абабегчы вакол валуна — і яно пасля збудзецца. Праўда гэта ці выдумка экскурсаводаў — кожны ахвотны можа праверыць на ўласным вопыце.

✓ **Спаса-Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр —** яшчэ адзін абавязковы пункт праграмы. У ім можна ўбачыць і адноўлены па эскізах Крыж Святой Еўфрасінні. Арыгінал, як вядома, таямнічым чынам знік падчас гітлераўскай акупацыі.

✓ Абавязкова варта пабываць у **Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку,** у які ўваходзіць 11 музеяў. Наведаць усе музеі можна, набыўшы агульны ўваходны квіток.

У гэты музей-запаведнік уваходзіць і адзіны ў Беларусі музей адной вуліцы, які называецца «Прагулка па Ніжне-Пакроўскай». Гэтая стацыянарная выстава фіксуе побыт горада ўзору 1910 года (менавіта ў тым годзе мошчы прападобнай Еўфрасінні Полацкай былі перавезены з Кіева-Пячэрскай лаўры на радзіму).

✓ Зазірніце ў былы **езуіцкі калегіум** (цяпер — будынак Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта). Тут можна заказаць экскурсію і атрымаць мудрагелістыя адказы на свае пытанні (на выбар — на рускай, беларускай, англійскай ці лацінскай мовах) у велізарнай механічнай галавы Габрыэля Грубера, пабудаванай у далёкім XVIII стагоддзі і адноўленай у 2015 годзе.

✓ Схадзіце ў **Музей сярэднявечнага рыцарства —** гэта адзін з прыватных музеяў Полацка. Тут вы ўбачыце інтэр'еры старадаўняга замка і прадметы побыту, а таксама рыцарскія латы і ўзбраенне: лукі, стрэлы, арбалеты, халодную зброю, сярод якой — меч X стагоддзя. Вялікае ўражанне можа зрабіць засценак, дзе паказаны катаванні таго часу. Часам экскурсію праводзіць сам гаспадар музея.

Не ўвайшлі ў наш топ-5, але таксама абавязковыя да прагляду — помнік літары Ў і памятны знак «Полацк — геаграфічны цэнтр Еўропы».

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

Наведалі ў 2015 годзе (арганізаваныя турысты):

Нацыянальны музей-запаведнік «Нясвіж» — 408 тысяч чалавек.

Замкавы комплекс «Мір» — 295 тысяч чалавек.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік — 220 тысяч чалавек.

Труба супрацьстаяння

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён дэманструе невялічкую прастору санвузла, дзе сапраўды кожны сантыметр на ўліку. Напрыклад, ад унітаза да пральнай машыны — 10 сантыметраў. Роўна столькі, на колькі прыйдзецца перасунуць унітаз, каб вызваліць месца для каналізацыйнай трубы.

Камунальнікі параілі наогул прыбраць пральную машыну. Але куды? Кухня і калідор у хрушчоўцы такія ж малюсенькія.

Дзяніс Жукаў вядзе перапіску з афіцыйнымі ўстановамі, але яго пратэсты супраць пагаршэння жыллёвых умоў ігнаруюцца. Малады чалавек уважліва вывучыў Жыллёвы кодэкс і ўпэўнены, што яго проста ігнаруюць.

— У дагаворы напісана, што будзе праведзены капрамонт унутраных інжынерных сістэм, а тое, што нам прапаноўваюць, называецца мадэрнізацыя, бо стары каналізацыйны стаяк мяняецца на 2 новыя, — кажа Дзяніс. — Акрамя гэтага, у раздзеле 1 артыкула 98 чорным па белым напісана: «Да пачатку правядзення рамонту трэба з удзельнікам ад жыхароў правесці агляд памяшканняў для ўдакладнення аб'ёмаў і відаў работ са складаннем акта абследавання, які з'яўляецца падставай для карэкціроўкі праектна-каштарыснай дакументацыі». Але нас пазбавілі права на гэту карэкціроўку.

— У нас ніколі не было праблем з каналізацыяй — труба чыгунная, 43 гады стаяла і яшчэ столькі ж прастаіць, — згодна з Дзянісам яго цешча, якая з'яўляецца ўласніцай гэтай кватэры. — З 2010 года мы пісалі ў ЖРЭУ і райвыканкам, каб нам правялі гарачую ваду. Кожны год нас абяцалі ўключыць у спіс, але безвынікова. У дамах пазнейшай забудовы зрабілі, а нам не. Цяпер гэтая паслуга стала платная. Мы змірыліся і купілі сабе воданагравальнае абсталяванне. Яно займае месца, але ж без яго нікуды. Але каналізацыйны стаяк нам у кватэры не патрэбен. Вы ж самі бачыце, што гэта пагоршыць нашы жыллёвыя ўмовы. Пральную машыну хоць на лесвічную пляцоўку вынось. У нашым калідоры, акрамя палічкі для абутку, нічога не ўмяшчаецца.

Жыхары кватэр, плошча санвузлоў якіх прадугледжвае ўстаноўку інжынерных збудаванняў, спачуваюць суседзям. Ганна з 15-й кватэры дэманструе прасторную нішу і добрую на выгляд трубу, якой яшчэ стаяць і стаяць. Выглядае труба пераканаўча. Жанчына таксама не бачыць сэнсу ў замене стаяка. Яе больш турбуе стан расколіны, што расце пад яе балконам.

— Зверху будынак пафарбавалі, але тым і абмежаваліся, — наракае яна. — Толькі тынкоўка ўжо абвальваецца.

Асабіста мяне ўразіў яшчэ і балкон. Мне здалося, што ён нахіліўся. Ды і поручні не ўнушалі ўпэўненасці. Жыхарка таксама пацвердзіла, што супрацоўнікі ЖЭУ раілі не абапірацца на іх. Не вельмі ўтульна і ў пад'ездзе дома. Са сцен месцамі абсыпалася тынкоўка. Але цяпер пра гэта мала хто згадвае. Усе сілы сем'і кінулі на барацьбу супраць дадатковага стаяка.

Між тым камунальнікі пачалі прымушаць незгаворлівых жыхароў на згоду праз суд. Дзяніс Жукаў дэманструе рашэнне суда, па якім ён павінен прадаставіць доступ у кватэру для правядзення работ. Ён і яго сям'я не згодны з гэтым рашэннем. А Вячаслаў Астапаў наогул адмовіўся падпісваць дагавор з УКП і лічыць, што пакуль усе жыхары не дадуць згоды на капрамонт, які закранае іх інтарэсы, заказчык не мае права яго рабіць. Ён наогул намераны адмовіцца ад яго, матывуючы тым, што артыкул №7 Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг» дазваляе яму гэта зрабіць.

— Ніякіх парушэнняў правоў жыхароў дома №6 па Віцебскім праспекце няма, — выказала свой пункт гледжання на праблему **начальнік аддзела капрамонту Магілёўскага гарадскога УКП Наталля АСТРОЎСКАЯ.** — Трэба выходзіць з таго, што інжынерныя сеткі — гэта камунальная маёмасць, а не ўласная. І мы маем права правесці замену. Тым больш што выйшлі ўсе тэрміны эксплуатацыі. А дзве каналізацыйныя трубы замест адной — гэта не наш капрыз. Пры распрацоўцы праекта тэхнічная экспертыза выдала прадпісанне, каб у кожнай кватэры быў асобны каналізацыйны стаяк (п.7.1.5 ТКП45-4.01-54-2007 г. Тэхнічнага кодэкса. Сістэмы ўнутранай каналізацыі будынкаў. — **Аўт.**). Гэта робіцца ў мэтах абароны інтарэсаў саміх жа спажыўцоў. Бо калі стаяк, агульны на 2 кватэры, заб'ецца, то чаму павінен пакутаваць гаспадар той кватэры, дзе знаходзяцца гэтыя камунікацыі? Яму спатрэбіцца прадастаўляць доступ у кватэру, магчымасць дабрацца да трубы. А сусед праз сценку, атрымліваецца, не нясе ніякай адказнасці. Гэта несправядліва, пагадзіцеся.

— А калі жыхары адмовяцца даць доступ у свае кватэры, нягледзячы на рашэнні суда?

— Мы проста скасуем дагавор. Але калі адбудзецца нейкая аварыя, ліквідацыя будзе праводзіцца цалкам за іх кошт. А гэта сумы вельмі адчувальныя.

Дарэчы, выпадак з домам па Віцебскім праспекце не выключэнне. Наогул у дамах, якім споўнілася больш за паўстагоддзя, капрамонты рэдка абыходзяцца без канфліктаў. Як сведчыць Наталля Астроўская, жыхары адмаўляюцца ад замены інжынерных сетак, ацяплення лоджый, бо гэта нельга зрабіць, не захапіўшы частку іх жыллёвай прасторы. Зразумела, што тэхнічныя ўмовы і нарматывы сёння зусім не такія, якія былі паўстагоддзя таму. Але чаму б для дамоў старой забудовы з іх канструктыўнымі асаблівасцямі не рабіць выключэнні? Інакш інтарэсы часткі жыхароў, як у доме №6 па Віцебскім праспекце Магілёва, непазбежна будуць закрануты.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Ад унітаза да пральнай машыны якраз столькі, колькі зойме стаяк.

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2016 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	на 01.07.2016	на 01.07.2015
1	2	3	5	6
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	664 800	565 583
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	5 413	4 887
4	Средства в Национальном банке	1103	1 676 336	709 062
5	Средства в банках	1104	1 511 819	1 580 532
6	Ценные бумаги	1105	7 837 928	3 914 846
7	Кредиты клиентам	1106	24 759 697	21 324 588
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	100 445	55 800
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	1 794 067	1 482 044
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	26 918	14 920
12	Отложенные налоговые активы	1111	108	-
13	Прочие активы	1112	383 805	287 211
14	ИТОГО активы	11	38 761 336	29 939 473
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
16	Средства Национального банка	1201	6 483	223
17	Средства банков	1202	17 662 824	13 935 195
18	Средства клиентов	1203	16 275 968	11 978 595
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	28 301	40 930
20	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
22	Прочие обязательства	1207	565 045	281 587
23	ВСЕГО обязательства	120	34 538 621	26 236 530
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
25	Уставный фонд	1211	1 174 075	1 174 075
26	Эмиссионный доход	1212	-	-
27	Резервный фонд	1213	474 458	420 273
28	Фонд переоценки статей баланса	1214	735 233	666 927
29	Накопленная прибыль	1215	1 838 949	1 441 668
30	ВСЕГО собственный капитал	121	4 222 715	3 702 943
31	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	38 761 336	29 939 473

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 6 месяцев 2016 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	за 6 месяцев 2016 года	за 6 месяцев 2015 года
1	2	3	5	6
1	Процентные доходы	2011	2 081 319	1 704 494
2	Процентные расходы	2012	1 065 994	952 251
3	Чистые процентные доходы	201	1 015 325	752 243
4	Комиссионные доходы	2021	439 932	385 003
5	Комиссионные расходы	2022	133 420	116 088
6	Чистые комиссионные доходы	202	306 512	268 915
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	6 432	3 238
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	284	2 226
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	98 597	253 227
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	107	2 378
11	Чистые отчисления в резервы	207	511 413	507 385
12	Прочие доходы	208	48 594	84 298
13	Операционные расходы	209	640 711	485 208
14	Прочие расходы	210	30 618	36 378
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	293 109	337 554
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	28 909	58 940
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	264 200	278 614

Председатель Правления Н.В.Лузгин

Главный бухгалтер Л.А.Филиппова

Дата подписания 7 июля 2016 года

Бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность за 2016 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 №6. УНП 100010078.

■ З нагоды

НАВУКОВЕЦ З ДУШОЙ ПАЭТА

Калі б мора было чарнілам, то хутчэй вычарпалася б мора, чым слова. Гэта ўсходняя мудрасць як мага лепш адлюстроўвае жыццёвы і навуковы шлях Віктара Пятровіча КРАСНЕЯ — выдатнага беларускага мовазнаўца, лексікографа, педагога, прафесара, выдатніка адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Віктар Красней нарадзіўся 20 ліпеня 1936 года ў вёсцы Хамічы Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1969 годзе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце паспяхова абараніў дысертацыю «Беларуская філалагічная тэрміналогія пачатку XX стагоддзя». Віктару Пятровічу належаць грунтоўныя распрацоўкі ў галіне беларускай тэрмінасістэмы, стылістыкі мастацкіх і навуковых тэкстаў. Навукова-педагагічная спадчына вучонага налічвае больш за 200 публікацый, сярод якіх каля 40 кніг.

Вучыць іншых — вялікі гонар і вялікая адказнасць. Не аднаму пакаленню беларусаў Віктар Пятровіч вядомы як удумлівы і руплівы педагог, аўтар серыі падручнікаў па беларускай мове для школ (разам з Я.М. Лаўрэлем, С.Р. Рачэўскім і інш.): «Беларуская мова» для 4 класа (1988, 2001), 5 класа (2008, 2014), 6 класа (2009, 2015). Гэта далёка не поўны спіс падручнікаў, кожны з якіх — сапраўдная крыніца ведаў для тых, хто спасцігае таямніцы і харастро роднага слова.

Гэты чалавек увасабляе партрэт сапраўднага беларуса — мудрага, памяркоўнага, сціплага, працавітага і ў той жа час узнёслага, рамантычнага і няўрымслівага. Беларуса, які штодня адчувае бязмежны клопат аб роднай мове, праз якую, па словах Віктара Пятровіча, кожны народ стварае сваю «мадэль» свету. Ён і сам з'яўляецца часткай гэтай «мадэлі», прыкладам шчырага служэння беларускаму слову — невычарпальнаму і натхняльнаму.

Калегі, аднадумцы, сябры Віктара Пятровіча шчыра віншуюць яго з юбілеем і дзеляцца сваімі ўспамінамі.

Мікалай Рыгоравіч ПРЫГОДЗІЧ, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ: **«Кожная новая сустрэча з прафесарам прыадкрывае ў яго асобе нешта раней незаўважанае...»**

— Віктар Пятровіч Красней для мяне найперш узор сапраўднага патрыёта-беларуса, шчырага і бескарыслівага дарадцы-навукоўца, удумлівага і разважлівага метадыста, аднаго з найбольш аўтарытэтных мовазнаўцаў краіны. А яшчэ ён надзвычай адказны чалавек, які інтарэсы іншага заўсёды ставіць вышэй за свае, імкнецца падтрымаць, знайсці правільнае выйсце ў складаных сітуацыях.

За больш як 30 гадоў сумеснай працы на філалагічным факультэце БДУ, здавалася б, ужо ўсё пра яго ведаеш. Але не. Кожная новая сустрэча з прафесарам прыадкрывае ў яго асобе нешта раней



незаўважанае, што да пэўнага часу не выяўлялася: жыццёвае асэнсаванне складаных і супярэчлівых праблем функцыянавання беларускай мовы як мовы дзяржаўнай і нацыяўтваральнай, непрыхаваны неспакой за лёс беларускага маўлення ў дзіцячым садку і сярэдняй школе. З ім па-ранейшаму прыемна абмеркаваць выдавецкія і чыста навуковыя праблемы, хоць і выпадаюць такія хвіліны не так часта, як хацелася б.

Магчыма, не кожны ведае пра незвычайную методыку напісання вучоным сваіх прац. У Віктара Пятровіча фактычна няма чарнавікоў — кожны тэкст у яго атрымліваецца як чыставік, бо ён даўно адшліфаваўся ў думках, колькі разоў вусна сфармуляваўся і зафіксаваўся ў памяці. У многіх працах лінгвіста лёгка заўважаецца рамантычна-ўзнёслы стыль аповеду, публіцыстычнае напаўненне думкі выразным словам, ёмкімі фразеалагізмамі, дарэчнымі прыказкамі і прымаўкамі, цытатамі з разнастайных вершаў, сотні якіх ён ведае на памяць.

Няхай жа не перапыняецца высокі палёт навуковага пошуку вучонага!

Алена Мікалаеўна ЛАПКОЎСКАЯ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, намеснік дэкана па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце педагагічнага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы: **«Я да сённяшняга дня захоўваю ўсе чарнавікі нашай работы»**.

— Маё першае знаёмства з Віктарам Пятровічам было «завочным». Адна з маіх студэнцкіх сябровак наведвала семінар, які ён праводзіў. Яна прыходзіла пасля заняткаў і так натхнёна і цікава расказвала пра выкладчыка, што я не вытрымала і ўжо практычна напрыканцы 3 курса папрасілася да Віктара Пятровіча на семінар, а затым «угаварыла» быць навуковым кіраўніком дыпломнай работы.

Работа над дыпломам была настолькі цікавай (безумоўна, у першую чаргу для мяне), што, калі на стол леглі 162 ад рукі напісаныя старонкі, я зразумела — на гэтым спыняцца не хачу. І толькі ціпер, адпрацаваўшы 20 гадоў ва ўніверсітэце, разумею, што дзякуючы Віктару Пятровічу, які, з аднаго боку, душэўна, тонка і далікатна падыходзіў да нявопытнага студэнта, а з другога боку, цвёрда, напорыста і з веданнем справы «зацягваў» у свет навукі, з'явілася гэта жаданне. Таму, закончыўшы ўніверсітэт, я добра ведала, што хачу працягваць гэтую справу і не хачу развітвацца з Віктарам Пятровічам.

Не ведаю, як адчуваюць сябе сучасныя студэнты, якія паступілі ў аспірантуру, магу толькі сказаць, што асабіста я была шчаслівая і задаволеная, бо напярэдзе мяне чакалі 3 гады цудоўных сустрэч з навуковым кіраўніком, і таму я дакладна ведала, што і як мне трэба рабіць. Я да сённяшняга дня захоўваю ўсе чарнавікі нашай работы, бо там ёсць праўкі, напісаныя акуратным почыркам Віктара Пятровіча.

Сёння мы гаворым, што Віктар Пятровіч — гэта навуковец з душой паэта. Так! Але мне здаецца, што гэта яшчэ і выдатны музыка, і таленавіты дырыжор. Бо як музычнаму інструменту для таго, каб ён загучаў, каб раскрылася сапраўдная сутнасць твора, неабходны віртуозны выканаўца, так і для маладога даследчыка важна трапіць у чуллівыя рукі майстра.

Дарагі Віктар Пятровіч, я ўдзячна лёсу за тое, што Вы ёсць у маім жыцці! Я жадаю Вам моцнага здароўя, шчасця і буду маліць Бога, каб анёл-ахоўнік заўсёды быў з Вамі з шырока раскрытымі крыламі!

Вячаслаў Пятровіч РАГОЙША, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры тэорыі літаратуры БДУ: **«...Старастам ён быў адменным...»**

— З цяперашнім юбілярам, прафесарам, а тады — дэмабілізаваным сяржантам Віцем Краснеем (Чырванеем — як за вочы і нават у вочы многія называлі яго) — я пазнаёміўся ў далёкім ужо верасні 1958 года. Тады мы адначасова паступілі на беларускае, дакладней — беларуска-рускае аддзяленне філалагічнага факультэта БДУ імя У.І. Леніна ў ліку пяцідзесяці шчасліўчыкаў. Кажу — шчасліўчыкаў, бо за бортам нашага філалагічнага карабля засталося нямала цікавых і цікаўных абітурыентаў, найперш тых, хто, як я, не меў двухгадовага працоўнага стажу ці службы ў арміі. Такіх тады прымалі толькі ў ліку 5% ад агульнай колькасці студэнтаў...

Факультэцкае начальства адразу ўлічыла сяржанцкую вывучку і вопыт Віктара — прызначыла старастам нашага аддзялення. Функцыю гэту ён цярпліва выконваў на працягу ўсіх пяці гадоў. Трэба прызнаць, старастам ён быў адменным: гультаям, прагульшчыкам заняткаў спуску не даваў, сам паказваў прыклад у вучобе, у фізічнай працы (а тады мы кожны год ездзілі «на бульбу», удзельнічалі ў будаўніцтве галоўнага корпуса ўніверсітэта, іншых мінскіх навабудаў), у выкананні патрульных абавязкаў «народных дружыннікаў» і інш. Наш дэкан, шаноўны прафесар Міхась Рыгоравіч Ларчанка не раз ставіў Віктара ў прыклад старастам суседніх аддзяленняў факультэта — рускага і журналістыкі, адзначаў падзякамі і рознымі граматамі.

У арганізацыі студэнцкага жыцця на курсе Віктару самааддана дапамагаў і яго аднагодак, наш нязменны камсамольскі сакратар Мікола Пашкевіч — таксама былы сяржант Савецкай Арміі. Дзякуючы найперш іх ініцыятыве і арганізацыйным здольнасцям на працягу пяці гадоў мы, апроч вучобы, сістэмна авалодвалі культурай у самым шырокім сэнсе гэтага слова — ад культуры паводзін да культуры маўлення. За невялікім выключэннем, нават тагачасныя першакурснікі былі сталымі людзьмі, з немалым жыццёвым вопытам. Але, з другога боку, з прабеламі ў ведах, з рознымі ідэйнымі і маральнымі прынцыпамі, з памылкамі ў маўленні, асабліва беларускім (выяўлялася армейская служба ў далёкіх ад Беларусі вайсковых акругах). Адразу ж на курсе была наладжана ўзаемадапамога ў падрыхтоўцы да практычных заняткаў, да залікаў і экзаменаў, асабліва па лацінскай, стараславянскай, замежных мовах. Былі вызначаны дні выключна беларускага маўлення паміж сабой. Сталі рэгулярна праводзіцца экскурсіі па літаратурных мясцінах Мінска (з абавязковым фатаграфаваннем, што пасля вельмі спатрэбілася пры стварэнні выпускных фотаальбомаў), у музеі, на розныя выстаўкі, культпаходы ў тэатры (найперш на спектаклі па «праграмных» творах з наступным іх абмеркаваннем), сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі і г.д. За час вучобы арганізавалі і некалькі турысцкіх паходаў па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю Адама Міцкевіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка і іншых духоўных волатаў зямлі беларускай. Усё гэта дазволіла не толькі як след вывучыць розныя філалагічныя прадметы, але глыбей авалодаць культурнай, гістарычнай спадчынай роднага і суседніх народаў, спасцігнуць таямніцы роднага слова, стаць сапраўднымі спецыялістамі-гуманітарыямі. Урэшце, па заканчэнні БДУ выявіць сябе ў розных галінах народнай гаспадаркі, адукацыі, культуры, навукі.

Так распарадзіўся лёс, што з Віктарам Пятровічам Краснеем мы пасля плячо ў плячо нямала гадоў прапрацавалі выкладчыкамі на філалагічным факультэце нашага ўніверсітэта. «Мая» кафедра беларускай літаратуры, дзе я распачаў свой працоўны шлях яшчэ ў 1967 годзе, а таксама кафедра тэорыі літаратуры, якую я ўзначаліў у 1994 годзе, і «яго» родная кафедра беларускай мовы заўсёды знаходзіліся ў дружных стасунках, рабілі, як мы кажам, адну справу — па магчымасці ўздымалі і ўздымаем на новы ўзровень беларускую філалагічную навуку, выхоўвалі і выхоўваем не толькі высокакваліфікаваных спецыялістаў, але і сваіх грамадзян, патрыётаў. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя...

Валянціна ЗРАЗІКАВА,
кандыдат філалагічных навук

■

АБСОЛЮТБАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 июля 2016 г.

Наименование банка: ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» (в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2016	01.07.2015
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	81 855	28 217
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	25 207	137 945
5	Средства в банках	1104	147 375	92 907
6	Ценные бумаги	1105	73 810	59 723
7	Кредиты клиентам	1106	517 356	289 595
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	105	1
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	66 411	46 865
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	30 240	-
12	Отложенные налоговые активы	1111	-	-
13	Прочие активы	1112	24 854	16 603
14	ИТОГО активы	11	967 213	671 856
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
16	Средства Национального банка	1201	3	3 410
17	Средства банков	1202	71 262	61 738
18	Средства клиентов	1203	299 064	166 457
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	109 911	-
20	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
22	Прочие обязательства	1207	5 956	4 576
23	ВСЕГО обязательства	120	486 196	236 181
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
25	Уставный фонд	1211	373 306	373 306
26	Эмиссионный доход	1212	-	-
27	Резервный фонд	1213	6 478	-
28	Фонды переоценки статей баланса	1214	29 870	28 352
29	Накопленная прибыль	1215	71 363	34 017
30	ВСЕГО собственный капитал	121	481 017	435 675
31	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	967 213	671 856

ОТЧЕТ
о прибылях и убытках
на 1 июля 2016 г.

Наименование банка: ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» (в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2016	01.07.2015
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	72 432	69 979
2	Процентные расходы	2012	22 408	9 291
3	Чистые процентные доходы	201	50 024	60 688
4	Комиссионные доходы	2021	4 701	6 611
5	Комиссионные расходы	2022	2 106	1 005
6	Чистые комиссионные доходы	202	2 595	5 606
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(89)	(16)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	23 981	20 916
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	800
11	Чистые отчисления в резервы	207	6 016	7 619
12	Прочие доходы	208	1 218	3 103
13	Операционные расходы	209	52 074	31 624
14	Прочие расходы	210	1 014	6 233
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	18 625	45 621
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	4 387	10 290
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	14 238	35 331

Руководитель В.И.Вашкевич

Главный бухгалтер О.С.Турбина

Дата подписания "11" июля 2016г.

Отчетность о деятельности ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» в полном объеме размещена на сайте www.absolutbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь №9 от 24.06.2015. УНП 100331707

«30» июля 2016 года в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гранд Фэшен Хаус».

Повестка дня:

1. О сделках Общества.

Место нахождения ОАО: г. Брест, ул. Куйбышева, 13.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Куйбышева, 13.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 с 25 июля по 29 июля 2016 г. с 9.00 до 16.00 либо 30 июля 2016 года по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 25 июля 2016 года.

Начало регистрации участников собрания: 9.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Совет директоров.

УНП 290671335

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже права заключения договора аренды земельного участка в г. Мосты
Организатор аукциона – Мостовский районный исполнительный комитет

Аукцион состоится в 11.00 30 августа 2016 г. в г. Мосты, пл. Ленина, 3.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Мосты, пл. Ленина, 3, каб. 217 с 8.00 до 17.00
Последний день приема заявлений – 24 августа 2016 г. до 17.00
Телефон для справок: 3-35-65 – землеустроительная служба Мостовского райисполкома

Номер лота	**1**
Адрес земельного участка, кадастровый номер	**агрогородок Дубно, ул. Октябрьская, 424081702101000200**
Целевое назначение земельного участка	**Установка и обслуживание временного торгового павильона**
Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	**1-16-03 размещение объектов розничной торговли**
Право на земельный участок, срок заключения договора аренды	**Аренда сроком на 5 лет**
Площадь, га	**0,0079**
Форма участка	**Четырехугольная**
Инженерная инфраструктура	**Имеется возможность подключения к сетям электро-, газо-, водоснабжения, канализация**
Наименование ограничений в праве	**0,0079 га – водоохранная зона рек и водоемов**
Начальная цена продажи права заключения договора аренды земельного участка, руб.	**12 руб. 74 коп.**
Задаток, руб.	**1 руб. 50 коп.**
Дополнительное условие	**Возместить затраты на изготовление градостроительного паспорта земельного участка в размере 381 рубль 60 копеек**

Задаток вносится на расчетный счет Мостовского райисполкома № 3642520000019 в РКЦ № 10 в г. Мосты филиала ОАО «Белагропромбанк» ГОУ г. Мосты, ул. Ленина, 21, код 457, УНП 500047193, ОКПО 04064103.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона (изъявившему желание на приобретение лота по начальной цене, увеличенной на 5%):

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона (по факту);

в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией возникновения права на земельный участок, а также переводом его в категорию земель промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения в Мостовское бюро Волковысского филиала республиканского унитарного предприятия «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

разработать проектную документацию на установку временного торгового павильона и утвердить ее в установленном порядке в срок, не превышающий трех месяцев со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок;

приступить к строительно-монтажным работам на предоставленном земельном участке после разработки и утверждения проектной документации, но не позднее шести месяцев со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок.

Условия проведения аукциона: аукцион проводится при наличии не менее двух участников на каждый из лотов.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане, подавшие в комиссию по организации и проведению аукционов в назначенный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в комиссию по организации и проведению аукционов подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной финансово-кредитной организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

ОАО «БелВанс»,

УНП 100512302, 220119, РБ, г. Минск, ул. Карбышева, 7, корп. 2.

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ 05.08.2016 г. по адресу: г. Минск, ул. 50 лет Победы, д. 5а, время проведения 10.00.

Повестка дня:

1. О нецелесообразности досудебного оздоровления ОАО «БелВанс».
2. О вхождении в процедуру банкротства ОАО «БелВанс».

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с документами по адресу: г. Минск, ул. 50 лет Победы, д. 5а с 14.00 по 17.00 каждую пятницу.

Начало регистрации лиц, имеющих право на участие в повторном собрании акционеров, в 9.00 05.08.2016 г.

Открытое акционерное общество

«Белдарпрод» (УНП 101098068)

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ 03.08.2016 г. по адресу: г. Минск, ул. Волгоградская, д. 45, время проведения 10.00.

Повестка дня:

1. Об утверждении промежуточного ликвидационного баланса Общества.
2. О распределении имущества Общества.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с документами по адресу: г. Минск, ул. Волгоградская, д. 45 с 14.00 по 17.00 ежедневно, кроме выходных и праздничных дней.

Начало регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании, 03.08.2016 г. в 9.00.

02.08.2016 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. О величине уставного фонда и номинальной стоимости акций общества.
2. О внесении изменений в устав общества и утверждении устава в новой редакции.
3. О выборах членов ревизионной комиссии общества.
4. О вознаграждении членов ревизионной комиссии.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни начиная с 25.07.2016 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНН 400022625

Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 23 августа 2016 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 192-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

№ предмета аукциона	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы	Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.) (в денежных единицах образца 2000 года)	Целевое использование имущества	Сумма задатка (руб.) (в денежных единицах образца 2000 года)	Характеристика имущества и иные сведения
Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский, *тел.: +375(17) 225 61 21, +375(17) 225 69 77*							
1	г. Минск, ул. Привокзальная, 5	16,8	3,0	57,12 (571 200)	Под организацию розничной торговли непродовольственной группы товаров, кроме товаров бывших в употреблении и товаров ритуального назначения; оказание услуг (в т.ч. фотоуслуг), кроме парикмахерских, проката, медицинских и ритуальных	5,70 (57 000)	Помещение расположено в главном корпусе Северного железнодорожного вокзала (на отметке – 4,650). Имеется центральное отопление, естественное освещение отсутствует, в ТЦ «Галилео» имеется платная парковка. Помещение сдается в аренду при условии выполнения арендатором, за счет собственных средств и без возмещения арендодателем каких-либо затрат, работ по разработке и согласованию установленным порядком ПСД, строительно-монтажных работ и ввода в эксплуатацию торгового павильона. **Срок аренды – 3 года**
Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений, *тел. +375 (17) 225 66 22*							
2	г. Минск, ул. Московская, 7	192,0	3,0	652,80 (6 528 000)	Под организацию розничной торговли непродовольственной группы товаров, кроме товаров бывших в употреблении и товаров ритуального назначения	65,20 (652 000)	Помещение в многоквартирном жилом доме. Год постройки – 1958. Кирпичные стены, крыша – мягкая рулонная, плиточные полы, центральное отопление, водопровод – трубы металлические от уличной сети, центральная канализация – чугунные трубы, электроснабжение – скрытая проводка
Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Борисовская дистанция пути, *тел.: 8 (0177) 70 42 19; 8 (0177) 70 45 36*							
3	Витебская обл., Толочинский р-н, Озерецкий с/с, 2	241,8	3,0	822,12 (8 221 200)	Под размещение работников, складских помещений, для осуществления деятельности по производству продукции; выполнение работ; услуги сетей сотовой радиотелефонной связи; туристические услуги; оказание банковских услуг; магазин розничной торговли продовольственными и непродовольственными товарами; размещение парикмахерской; услуги по ремонту, пошиву и вязанию трикотажных изделий; услуги по ремонту и пошиву швейных, меховых, кожаных изделий, головных уборов и изделий текстильной галантереи; услуги по ремонту кожгалантереи и зонтов	82,20 (822 000)	Здание кладовой. Имеются: центральное отопление, водоснабжение и канализация, электроснабжение. Телефонная связь отсутствует
4	Витебская обл., Оршанский р-н, Задровьевский с/с, 4	243,4	3,0	827,56 (8 275 600)		82,70 (827 000)	Здание кладовой. Имеются: центральное отопление, водоснабжение и канализация, электроснабжение. Телефонная связь отсутствует
Арендодатель – БелНИИТ «Транстехника», *тел. +375(17) 331 62 63*							
5	г. Минск, ул. Платонова, 22	158,7	1,18	539,58 (5 395 800)	Под производственные цели, складские помещения	53,90 (539 000)	Встроенные помещения в одноэтажном здании. Имеются: электроснабжение, водоснабжение, естественное освещение. **Срок аренды – 3 года**

БАВ – базовая арендная величина с 01.07.2016 составляет 13,60 рублей.

Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.

Аукцион состоится **23 августа 2016 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра Имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель**. Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

Лицо, желающее принять участие в аукционе:

- уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 192 от 23.08.2016 по предмету аукциона №** _____), перечисляемый на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, УНП 190398583, государственное предприятие «МГЦН» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов;**

- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

индивидуальный предприниматель:

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

физическое лицо – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 26 июля 2016 г. по 17 августа 2016 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. *При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

Порядок определения победителя аукциона:

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 2 100 рублей; *(21 000 000 рублей в денежных единицах образца 2000 года).*

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

Важно! *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды помещения, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

Договора аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Телефоны для справок: отдел аукционов – + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды** – + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия** – + 375 (17) 328 36 58.

Интернет: www.mgcn.by.

Мо Янь. Пісьменнік з народа

Кітай і нават кітайская літаратура становяцца ўсё бліжэй да Беларусі. І нам ужо вядома не толькі класіка прыгожага пісьменства Паднябеснай, але і сучасныя проза і паэзія. Некалі, у 1950—1960-я гады, цэлая кагорта беларускіх пісьменнікаў спрычынілася да пераўвасаблення кітайскай літаратуры на мову Янкі Купалы: Васіль Вітка, Янка Брыль, Сяргей Дзяргай, Лідзія Арабей, Мікола Татур, пазней — Анэля Тулупава, Рыгор Барадулін, Валянціна Коўтун... Яшчэ пазней — Мікола Мятліцкі, Навум Гальпяровіч, Рагнед Малахоўскі. Усе яны карысталіся тэкстамі на рускай мове, зазіраючы ў кітайскі свет дзякуючы слынным перакладчыкам М. Басманаву, А. Гітовічу... Сёння на старонках беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыкі з'яўляюцца перакладчыкі, якія працуюць з арыгіналам. Найперш гэта Алена Раманоўская, Дар'я Нечыпарук, Кацярына Гардзей, Ганна Холева... Можа, якраз хтосьці з іх адолее новыя вяршыні і прапануе беларускаму чытачу прачытаць на роднай мове раманы Мо Яня ці каго яшчэ з вялікіх кітайскіх пісьменнікаў сучаснасці. А пакуль — наша гутарка з Ігарам ЯГОРАВЫМ, рускім перакладчыкам лаўрэата Нобелеўскай прэміі Мо Яня.



— Вы пачалі перакладаць Мо Яня яшчэ да таго, як ён стаў лаўрэатам Нобелеўскай прэміі. Што прымусіла вас звярнуць увагу на раман «Краіна віна»?

— Творы аўтараў, якія з'явіліся ў Кітаі ў пачатку 1980-х гадоў з пачаткам палітыкі «рэформаў і адкрытасці», сярод якіх быў і Мо Янь, былі абсалютна не падобныя на творы кітайскай літаратуры мінулых гадоў, якія цалкам вынікалі з палітыкі, адпаведнай агучанаму яшчэ Маа Цзэдунам у 1941 годзе «творчаму метаду спалучэння рэвалюцыйнага рэалізму і рэвалюцыйнага рамантызму». Для чытача, які знаёмы з палітычнымі агіткамі таго часу, ідэалізаванымі героямі і прыдуманым аповедам, гэтыя новыя кнігі былі падобныя глытку свежага паветра. Гэта была сапраўдная літаратура, хоць на ёй і адчуваўся ўплыў перакладаў літаратуры сусветнай, якія хлынулі ў той час у Кітай. «Краіна віна» адносіцца да эксперыментальных твораў Мо Яня, ён тады яшчэ шукаў свой стыль, і ў рамане аддадзена істотная даніна ўвагі постмадэрнізму. Менавіта гэта, па маіх уяўленнях, лепей за ўсё падыходзіла для знаёмства рускага чытача з яго творчасцю, нягледзячы на мноства кітайскіх рэалій, алюзій, ідыяматычных выразаў і традыцыйны кітайскі рэалізм, які часам пераходзіць у натуралізм. Тады Мо Яня ў нас ніхто не ведаў, і я спадзяваўся, што пасля прачытання такога рамана, дзе змешаны фантастыка і рэальнасць і на галаву чытача нясецца лавіна самай рознай інфармацыі, імя аўтара запомніцца незалежна ад зробленага ўражання — станоўчага ці адмоўнага. Так, уласна кажучы, і здарылася: думкі чытачоў падзяліліся 50 на 50.

— Раман «Вялікія грудзі, шырокі зад» шакіраваў чытача, асабліва кансерватыўнага, сваёй назвай. Вы можаце з пэўнай доляй дакладнасці сцвярджаць, што ў гэтым творы адлюстраваны твар кітайскай цывілізацыі ці хаця б твар сучаснага Кітая?

— Мяне выдаўцы непрыемна ўразілі вокладкай для рамана, які быў выдадзены рэдкім для нашага часу дванаццацітысячным накладам. А назву для рамана, па прызнанні самога аўтара, падказала яму старажытная жаночая статуэтка з буйнымі формамі, падобная на нашых каменных баб у скіфскіх стэпах. Галоўная гераіня рамана, простая сялянка, выкарміла вялікімі грудзьмі сваіх і чужых дзяцей і выстаяла на працягу амаль цэлага стагоддзя драматычнай і крывавай кітайскай гісторыі. Мо Янь лічыць гэты твор цэнтральным і гаворыць, што можна не чытаць іншых раманаў, але для разумення яго творчасці «Вялікія грудзі...» трэба абавязкова прачытаць. Гэта раман пра жыццё простага люду, якому любая ўлада не прыносіць нічога, акрамя новых нягод, пра народ-працаўнік, захавальнік шматвекавых традыцый і народнай культуры. Ён знаёміць з многімі асаблівасцямі кітайцаў, прывабнымі і не вельмі, насычаны звесткамі пра традыцыйныя звычаі, у прыватнасці дае яркае ўяўленне пра адносіны кітайцаў да чужаземцаў. У гэтым сэнсе раман часткова адлюстроўвае асаблівасці кітайскай цывілізацыі. І ў нейкай ступені і сённяшні дзень Кітая, таму што традыцыі працягваюць жыць, нягледзячы на велізарны ўплыў цывілізацыі еўрапейскай.

— Сёння шмат гавораць пра іншыя кітайскія раманы — пра «Татэм ваўка» Цзян Жуна, «Апошняга імператара» Су Туна... Наколькі Мо Янь мацнейшы ў сваіх мастацкіх і, можа быць, ідэйных памкненнях?

— Параўноўваць гэтых аўтараў, відаць, няправільна, дужа яны розныя. Цзян Жун увогуле не прафесійны пісьменнік, хоць «Татэм ваўка», безумоўна, цікавы і сюжэтам, і тэмай экалогіі, і гісторыяй ваўкоў, і супрацьпастаўленнем манголаў і кітайцаў. І «Апошні імператар» (гэтую назву дало выдавецтва, увогуле раман называецца «Мая царская доля») заслугоўвае ўвагі як вытанчаная, хоць і страшная, карціна-развага па матывах старажытнай кітайскай гісторыі. Але Су Тун — пісьменнік больш камерны, ён цураецца эпічнага і звяртаецца да філігранных псіхалагічных партрэтаў герояў, іх думак і сумненняў. Ён вядомы як вялікі знаўца жаночай душы. У Мо Яня падыход больш маштабны і шматгранны. У сваіх творах ён не баіцца закранаць самыя адчувальныя тэмы кітайскай гісторыі. Напрыклад, раман «Кабы» (2009) прысвечаны такой балючай для кітайцаў тэме, як абмежаванне нараджальнасці. Яго тэксты вельмі насычаныя, ён быццам спяшаецца выказацца. Тонкі стыліст, ён нярэдка апавядае не ад адной асобы.

— У адным са сваіх інтэрв'ю вы працытавалі наступныя словы, прысвечаныя Мо Яню: «Па сваім духоўным настроі творы Мо Яня больш кітайскія, чым у якога іншага пісьменніка, ён валодае... сілай, якая мае глыбокае карэнне ў зямлі Кітая». Што ўсё ж такі гэта за сіла?

— «Кітаізм» Мо Яня, пэўна, заключаецца ў тым, што ён чалавек з народа, просты кітаец з моцнай сялянскай закваскай. Яму не трэба «хадзіць у народ», вучыцца ў яго, ён з дзяцінства ўвабраў народную культуру, традыцыі, слухаў папулярных казачнікаў шашуды, захоплена чытаў класічныя кітайскія раманы: яго любімы раман — «Рачныя затокі». Ён ведае, што такое галоднае дзяцінства, на сабе выпрабаваў палітычныя рэпрэсіі. Са сваім «няправільным» паходжаннем (ён з сям'і заможнага селяніна, па-нашаму — кулака) прайшоў праз гарніла палітычных кампаній. Таму яго творы напісаны з пункту гледжання чалавека з народа. У гэтым, пэўна, і ёсць яго сіла. Той самы вядомы крытык Лі Цзінцзэ, словы якога вы прывялі, адзначаў, што за трыццаць гадоў Мо Янь зрабіў для кітайскай літаратуры болей, чым любы іншы кітайскі пісьменнік. Заўважым, праўда, што ў Кітаі не любяць гаварыць «самы лепшы», а выкарыстоўваюць формулу «адзін з лепшых».

— Ацэнка ці фармулёўка Нобелеўскага камітэта ў дачыненні да Мо Яня наступная: «Галюцынатарны рэалізм аб'ядноўвае народныя казкі з гісторыяй і сучаснасцю». Дык ад чаго, ад каго ў прозе Мо Яня болей — ад рэаліста ці ад казачніка?

— Па праўдзе кажучы, я быў досыць здзіўлены, калі даведаўся аб прысуджэнні Мо Яню Нобелеўскай прэміі, хоць ён, несумненна, варты гэтай высокай узнагароды. Здзіўлены таму, што дужа часта ў апошнія гады гэтая прэмія ўручаецца больш па палітычных матывах, а не за вышыні літаратурнай творчасці. У сваёй нобелеўскай лекцыі Мо Янь заявіў: «Я — казачнік». Там жа ён дае і азначэнне ролі пісьменніка, якая дазваляе зразумець яго пазіцыю. Дазволю сабе шырокую цытату: «Як член грамадства пісьменнік, зразумела, мае сваю пазіцыю і свой пункт гледжання, але пры стварэнні твора ён павінен выступаць як гуманіст, і людзі ў яго павінны заставацца людзьмі. Хіба тады літаратура зможа не толькі адштурхоўвацца ад нейкай падзеі, але і ісці далей яе, не толькі цікавіцца палітыкай, але і пераўзыходзіць яе. Доўгі час маё жыццё было напоўнена нягодамі, і, магчыма, дзякуючы гэтаму я набыў даволі глыбокае разуменне чалавечай прыроды. Я ведаю, што такое сапраўдная смеласць, разумею, што такое сапраўднае спачуванне. Я ведаю, што ў душы кожнага чалавека ёсць нейкая туманная частка, дзе цяжка сказаць, што правільна і што няправільна, што ёсць дабро і што ёсць зло. Якраз у гэтай частцы і ёсць дзе разгарнуцца таленту пісьменніка. І калі ў творы дакладна і па-жывому апісваецца гэтая поўная супярэчнасцяў туманная частка, ён абавязкова выходзіць за межы палітыкі і абумоўлівае высокі ўзровень літаратурнага майстэрства».

— А што за гісторыя з забароненым раманам Мо Яня — «Часночныя напевы»?..

— Раман «Часночныя напевы», які выйшаў у 1988 годзе, заснаваны на рэальных падзеях у павеце Гаомі, родным павеце Мо Яня, так званым «часночным інцыдэнце», калі сяляне пратэставалі супраць палітыкі ўлад. Мо Янь адгукнуўся на гэту падзею і за трыццаць пяць дзён напісаў амаль трохсотстаронкавы раман. А забаранілі раман, наколькі мне вядома, праз год у сувязі з падзеямі на плошчы Цяньаньмэнь. «Часночныя напевы» быў не адзіным раманам Мо Яня, забароненым цэнзурай. Астракізму была падвергнута і першая рэдакцыя рамана «Краіна віна» (1993): дужа яркай атрымалася гэтая вострая сатыра на норавы чыноўнікаў і партыйных функцыянераў. Дасталося ад крытыкаў і раману «Вялікія грудзі, шырокі зад» (1996): аўтара называлі ледзьве не фашыстам, які ачарняе айчынную гісторыю. Мо Янь жа адным з першых звярнуўся ў рамане да тэмы жорсткай братазабойчай грамадзянскай вайны 1945—1949 гадоў паміж нацыяналістамі і камуністамі, а таксама паказаў у рамане жахлівы голад у Кітаі ў 1958—1960-х гадах.

— Псеўданім Мо Янь (сапраўднае імя — Гуань Моі) значыць «маўчы». Ці ўсё паспеў сказаць пра Кітай нобелеўскі лаўрэат Мо Янь?

— На сённяшні дзень Мо Янь надрукаваў 11 раманаў, больш за 60 аповесцяў і мноства апавяданняў. Але, па ўласным прызнанні, у яго ў галаве яшчэ тэм на тры сотні раманаў. Як мне здаецца, гэты найталенавіцейшы сялянскі самародак можа яшчэ шмат чаго расказаць свайму народу і свету.

— Вы неяк назвалі сярод кітайскіх пісьменнікаў, таксама вартых Нобеля, Су Тун, Бі Фэйюй, Юй Хуа. Чым менавіта яны вызначаюцца ў акіяне вялікай айчыннай літаратуры?

— Вышэйназваныя пісьменнікі, безумоўна, цікавыя і таленавітыя, але яны названы ў першую чаргу таму, што найбольш вядомыя на Захадзе, асабліва Юй Хуа. А кітайская літаратура — гэта сапраўды неабсяжны акіян аўтараў і твораў, сярод якіх, пэўна ж, ёсць пакуль невядомыя будучыні нобелеўскія лаўрэаты.

— Нобелеўскую прэмію па літаратуры ў 2015 годзе атрымала Святлана Алексіевіч. Амаль усе яе творы яшчэ да рашэння Нобелеўскага камітэта ўжо былі перакладзены на кітайскую мову. У іх — Алексіевіч і Мо Яня — ёсць нешта агульнае?

— Кітайцы вельмі пільна сочаць за літаратурай на рускай мове і вельмі шмат перакладаюць. Таму не дзіўна, што яны даўно пераклалі творы Святланы Алексіевіч. Не магу сказаць, што добра знаёмы з яе творчасцю, чытаў толькі «У вайны не жаночае аблічча». І знайсці нешта агульнае ў яе з Мо Янем не змагу. Тым больш што яна піша не мастацкую прозу, як цяпер гавораць, а — нон-фікшн..., і матывы прысуджэння ёй Нобелеўскай прэміі, як мне ўяўляецца, крыху іншыя.

Гутарыў Кастусь ЛАДУЦЬКА.

ТЭРЫТОРЫЯ ЗДАРОЎЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аптымальную працягласць дыстанцыі на сцяжыне здароўя кожны, зразумела, выбірае сам. Вызначыць яе вельмі проста, бо на ўсім шляху зрабілі разметку праз кожныя 100 метраў. Пры гэтым можна скарыстацца некалькімі маршрутамі. Напрыклад, адзін з найбольш запатрабаваных — 3200 метраў (1600 — амаль да Нёмана і зваротны шлях), а другі — кругавы даўжынёй 4 кіламетры. На другім, дарэчы, ёсць не толькі разметка, але і надпісы на асфальце, якія падбадзёрваюць аматараў хадзьбы і бегу. На фінішы — «Малайчына!». Ёсць і іншыя пешыя маршруты. Навокал лес, чыстае паветра... З некаторымі людзьмі, такімі ж хадакамі вітаешся ўжо як са знаёмымі. А калі пашанцуе, то можна сустрэць і аднаго з прадстаўнікоў тутэйшага жывёльнага свету — вавёрку.

На сцяжыне здароўя.

А вось сустрэчы з кляшчамі, канешне, трэба пазбягаць. Для гэтага, хоць у лесапарку і праводзяць супрацьклешчавую апрацоўку адпаведнымі сродкамі, варта належным чынам апранацца. І тады нішто не сапсуе пазітыўнага настрою.

І пешшу, і веласіпедам

Аб парадку ў зоне адпачынку ў Пышках клапоцяцца работнікі мясцовай камунальнай службы, зелянгаса. З самай раніцы яны наводзяць тут марафет — убіраюць смецце, падкошваюць траву. Чыста там, дзе не смецяць, і адпаведны менталітэт у жыхароў горада над Нёманам паступова фарміруецца. Тым больш што створаны і адпаведныя ўмовы — сцяжына здароўя аснашчана дастатковай колькасцю сметніц, кантэйнераў для збору пластыкавых і іншых адходаў.

Да нядаўняга часу ў Пышках былі даволі напружаныя адносіны паміж пешаходамі і веласіпедыстамі. Здаралася, яны не маглі падзяліць паміж сабой дарогу і былі нават выпадкі, калі веласіпедыст прычыняў пешаходу траўму. Але зараз створаны ўсе неабходныя ўмовы для, так бы мовіць, мірнага суіснавання. Сцяжына здароўя і шэраг іншых маршрутаў — выключна для пешаходаў, пра што нагадвае адпаведны дарожны знак. А для веласіпедыстаў створаны свае маршруты самай рознай працягласці. Адзін з іх — шасцікіламетровы, другі — 31 кіламетр (па маршруце — 12 месцаў адпачынку), а трэці пачынаецца каля сцяжыны здароўя і праз 67 кіламетраў заканчваецца ў суседнім Друскінінкаі. Аб гэтым паклапацілася Гродзенскае абласное аддзяленне Рэспубліканскага турысцка-спартыўнага саюза разам з мясцовымі ўладамі і замежнымі партнёрамі па праектах трансграничнага супрацоўніцтва.

Ёсць нават «Джунглі»

У Пышках шмат лавак, альтанак і, разам з тым, літаральна на вачах пашыраецца інфраструктура актыўнага адпачынку, фізкультуры і спорту. Нядаўна, напрыклад, да паслуг усіх зацікаўленых з'явілася пляцоўка для заняткаў варкаўтам — вулічнай гімнастыкай. Усталявалі 7 спецыяльных комплексаў, у аснашчэнне якіх уваходзяць турнікі, брусы, лесвіцы і іншыя прылады. Выдатная трэнажорная зала пад адкрытым небам, прычым бясплатная для наведвальнікаў, без абмежавання па часе на заняткі. Хтосьці спецыяльна сюды прыходзіць, а можна і сумясціць практыкаванні на трэнажорах з хадзьбой, бегам. Дарэчы, летась у Гродне стварылі клуб аматараў бегу «Ран4фан» (з англійскай — бег у радасць) і амаль кожную нядзелю ў Пышках адбываюцца забегі, у якіх могуць паўдзельнічаць усе ахвотныя. Рэкордаў не ставяць, але карысць відавочная, асабліва калі навічок прыслухаецца да парад людзей з вопытам.

Ёсць у Пышках і... джунглі. «Джунглі-парк» — гэта вяровачны комплекс этапаў паміж дрэвамі на той ці іншай вышыні, які разлічаны на наведвальнікаў рознага ўзросту і фізічнай падрыхтоўкі. Найпрасцейшая паласа перашкод прызначана дзецям ад 3 да 5-6 гадоў, а дарослыя, самыя смелыя і спрытныя спрабуюць пакарыць экстрым-трасу.

Апошняя навінка — шматфункцыянальная спартпляцоўка на базе фізкультурна-аздараўленчага комплексу Цэнтра алімпійскага рэзерву па хакеі з шайбай. Побач з лядовай арэнай цяпер можна гуляць і ў футбол, баскетбол, валейбол, тэніс, а таксама займацца на сілавых трэнажорах. Неўзабаве тут з'явіцца і крыты футбольны манеж. Што тычыцца паслуг пракату, то няма дэфіцыту ў веласіпедах, звычайных і ролікавых каньках, лыжах, санках...

Вось такая яна, «тэрыторыя здароўя» ў Пышках. Прыродная жамчужына, якую пашчасціла мець далёка не ўсім вялікім гарадам. А ёсць жа яшчэ лесапарк «Румлёва» — помнік прыроды мясцовага значэння, парк імя Жана Эмануэля Жылібера, Каложскі парк... Сапраўднае «зялёнае» багацце, якім гродзенцам трэба ганарыцца і з толкам, з карысцю для свайго здароўя і павагай да прыроды карыстацца.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

■ Чулі?!

У СЛАЎГАРАДЗЕ АДКРЫЛІ СЫРНУЮ КРАМУ

Не дзіўна, што яна з'явілася ў сталіцы сырнага фэсту, які адзначаецца тут ужо 5 гадоў. Мясцовыя сыравары і раней прадавалі свой тавар на слаўгарадскім рынку, але зараз усё будзе на іншым узроўні. У сценах былой гаспадарчай крамы размясціўся цэлы цэнтр сырнага мастацтва. Умоўна ён падзелены на 4 зоны, адна з якіх прызначана непасрэдна для гандлю, другая — для правядзення майстар-класаў, трэцяя, афіцыйная — для дзелавых сустрэч і чацвёртая, гістарычная — для дэманстрацыі паходжання слаўгарадскага сыру. Макеты печкі, кароў, коз, прадметы сельскага інвентару — наглядны дапаможнік для тых, хто думае, што сыр нараджаецца па ўзмаху чароўнай палачкі на паліцах крам. Частка экспанатаў ужо ёсць, але калекцыя будзе папаўняцца. Тут жа можна будзе прасачыць гісторыю развіцця сырнага фэсту. Ёсць першыя праграмкі, выпускі прымеркаванага да падзеі бюлетэню.

Фота Аксаны НЯМЦОВАЙ.

А галоўнае, цяпер усім прыхільнікам слаўгарадскіх сыроў будзе прасцей набыць любімыя гатункі. Іх, дарэчы, 50 найменняў — з каровінага і казінага малака. Пра папулярнасць прадукцыі сведчыць тое, што на нядаўнім купальскім свяце «Александрыя збірае сяброў» слаўгарадскія сыравары за некалькі гадзін прадалі 150 кілаграмаў сыроў. Некаторыя пакупнікі з Расіі ехалі на свята мэтанакіравана, каб купіць слаўгарадскі сыр.

Рэалізаваць ініцыятыву з сырнай крамай дапамог праект ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Ініцыятыва слаўгарадскіх сыраварэў перамагла ў конкурсе і на яе рэалізацыю было выдзелена 18 тысяч еўра.

— На гэтыя грошы мы набылі неабходнае абсталяванне, касцюмы, мэблю. Распрацавалі экскурсійную і анімацыйную праграму, 2 гастранамічныя турмаршруты,— паведаміла каардынатар ініцыятывы Галіна Таран.

А яшчэ сыравары правялі сертыфікацыю сваіх сыроў, каб выявіць, які з іх карыстаецца большым попытам. Арганізавалі на рынку дэгустацыю і вылучылі найлепшы гатунак, якому прысвоілі тытул «Народная марка — 2016».

Падчас адкрыцця ў гасцях сырнай крамы пабывала славутая кулінарная экспедыцыя пад кіраўніцтвам эксперта беларускай кухні Алены Мікульчык. Візіт у Магілёўскую вобласць быў абумоўлены вялікім попытам на слаўгарадскія сыры і дрыбінскі мёд. Гэтыя нацыянальныя стравы не на жарт дадаткова прывабліваюць на Магілёўшчыну турыстаў. Слаўгарадскія сыравары цяпер актыўна працуюць над двума турыстычнымі маршрутамі, якія пройдуць па знакавых мясцінах Слаўгарадскага раёна. Людзі змогуць пабачыць не толькі мясцовыя славутасці, але і паназіраць, як вырабляецца смачны прадукт у хатніх умовах. Дапамагае майстрыхам у рэалізацыі ініцыятывы мясцовы фонд развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра».

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

МАЛАДЫМ НА ЎСПАМІН

Гэта гісторыя пачалася гадоў з трыццаць таму, а скончылася зусім нядаўна ды і то выпадкова.

...Якія вяселлі былі даўней, старэйшым расказваць не трэба — яны памятаюць. А вось маладым, можа, і цікава даведацца, што гарэлку ў крамах тады амаль не купляліі — не ленаваліся, гналі сваю. Займаліся гэтым, як правіла, бацькі маладых, але ж былі і выключэнні. Прынамсі, у нашым выпадку за дзень да вяселля «ля апарата» сядзела... сама нявеста: яна — як чалавек адказны — сачыла за агнём, за якасцю прадукту. Гэта значыць, пакрысе знімала пробу: ці добры ж?.. А ў выніку перастаралася, небарака: накаштавалася так, што дзе сядзела, там і заснула.

Зранку да яе прыехаў жаніх. Паглядзеў на «спячую прыгажуню» і не на жарт разгубіўся. З аднаго боку — нельга жаніцца: п'яніца! А з другога — усё падрыхтавана, госці (амаль сто чалавек!) з'язджаюцца, парсюкі заколаты, гарманіст з фатографам задатак узялі... Нічога, значыць, не зробіш — вяселлю быць!

Пабудзіў ён сваю «прыгажуню» і яшчэ раз задумаўся: твар у той апухлы (ад сну і гарэлкі), валасы растрапаныя... Вадзічкі, бедная, выпіла і заснула зноў! Ледзьве расштурхалі яе, ледзьве ў боскі стан прывялі — павезлі ў касцёл да шлюбу.

А перад ім жа споведзь!

Ксёндз толькі глянуў на яе, толькі ўнюхаў спіртное і такую мараль распачаў, што дзеўцы не тое што замуж, жыць расхацелася!

Але ж пашчасціла — святар адыходлівы быў: як даведаўся, што нявеста не проста так выпівала, што яна для гасцей старалася — адпусціў грахі, павянчаў...

І загуло ў вёсцы вяселле! І паспытала яно нявесцінага «варыва», і заспявала, і заскакала: ва ўсю грымела музыка!

Старанна — ва ўсякім разе спачатку — працаваў і фатограф. Трэба сказаць, што ён у той час трэцім чалавекам на вяселлях быў (пасля нявесты з жаніхом), бо тады ж не тое што сучасных айфонаў, нават «мыльніц» у людзей не было! А ў аб'ектыў трапіць хацелася... У выніку да фатографа цэлыя чэргі выстройваліся. І ці не кожны хацеў нечым спадабацца майстру, нечым такім запомніцца, каб разлічваць потым на добрыя здымкі...

Вось і ўсміхаліся яму, вось і... налівалі. Адмаўляцца той не ўмеў.

Карацей, хапіў ён лішняга, згубіў сваю камеру, а з ёй, адпаведна, і гісторыю вяселля: ніводнай картачкі не засталося **б,** калі б... на бяседу, на так званыя «сто грам за маладых» разам з іншай моладдзю не заблукаў выпадковы разявака. Ні маладыя, ні тым больш гарэлка яго не цікавілі. Але ў нявесты была прыгажуня-сяброўка... Не адзін таемны паклоннік паглядаў на яе! А гэты — употай... «фоткаў» — каб потым смела любавацца. У кадр час ад часу траплялі і маладыя.

...Не так даўно лёс звёў іх — ужо сталых сур'ёзных людзей, з тым «хлопцам». Разгаварыліся, сталі ўспамінаць мінулае — у тым ліку і вяселле, п'янага фатографа...

І тут раптам высветлілася, што быў яшчэ адзін, цвярозы, што ён захаваў фотакарткі, і, паколькі з той прыгажуняй у яго ўсё роўна нічога не склалася, гатовы аддаць ім — на доўгую добрую памяць.

...А лепшая ці бывае?

Аляксандр Сенюць,
к.п. Нарач, Мядзельскі раён.

КАЗА І ДЗІЦЯ З АСФАЛЬТУ

Калі б не блізкая дэнамінацыя, людзі сталага веку, мусіць, дагэтуль гаварылі б пра пенсійны ўзрост. Падлічвалі б, колькі каму засталося да «дзембеля», хто паспявае ў «апошні вагон», а хто не, хто збіраецца сыходзіць з працы, а хто застаецца.

Застацца — пры ўмове, што ёсць здароўе. Ну, вядома ж, добра было б: як-ніяк і зарплату атрымаеш, і трохі пенсіі... Але ж і ў тым, каб пайсці на так званы заслужаны адпачынак, перавагі таксама ёсць. Ва ўсякім разе мая прыяцелька Ніна Фёдараўна спала і бачыла, як ёй споўніцца 55, як яна пакіне працу і як нарэшце болей часу стане праводзіць з любімай унучкай Волечкай. «Ніхто яе лепш не дагледзіць, чым я і нідзе ёй лепей не будзе, чым тут, на свежым паветры, у вёсцы!», — загадзя даводзіла яна сваёй дачцэ і зяцю.

І такі ж давяла: сказалі, што прывязуць «высокую» госцю (Волечцы пяць гадкоў).

Бабуля ўзялася рыхтавацца: старанна вычышчала хату, пераклейвала шпалеры, вешала новыя фіранкі. Ды што там — яна для ўнучкі нават казу купіла, прыгожую, бялюткую, з доўгай поўсцю. І не прагадала: палюбіла Волечка казінае малако: піць стала, колькі ні дай. Бабуля нацешыцца не магла!

Але ж, як той казаў, «нядоўга музыка іграла...». Стала заўважаць гаспадыня, што раніцай малако ў казы ёсць, а вось вечарам — ну хіба крыху.

Сабралі «сямейную раду», сталі думаць, што ж за ліха такое: сталі гаварыць пра нейкага вужа, які, маўляў, можа высмоктваць малако, пра нейкую жабу, якая, як быццам, таксама можа; грашылі на суседа, але ж потым падазрэнні знялі, бо малако — не гарэлка. А ўрэшце выклікалі ветэрынара...

Чакаючы, пакуль той прыйдзе, бабуля корпалася ў градах, Волечка непадалёк гуляла ў пясочку. Але ж раптам яе чырвоная сукеначка мільгнула каля плота...

А далей гаспадыня ўбачыла, як малая, прыхапіўшы ля студні ладную конаўку, пашыбавала да казы, як пагладзіла ёй рожкі, як паставіла долу пасудзінку, як стала цягаць за дойкі...

Раз на раз, вядома ж, не прыходзілася: струмені малака білі то ў траву, то малой на ногі, то на падол сукенкі... Але ж нешта трапляла і ў конаўку, бо ўрэшце дзяўчынка ў абедзве ручкі падняла яе і нагбом апрастала. Потым паставіла пасудзінку на камень і пабегла гуляць далей.

Такім вось чынам «знайшоўся» вячэрні ўдой. І трапіў ён, можна сказаць, па прызначэнні: каза ж куплялася дзеля ўнучкі.

Бабулю ў гэтым выпадку здзівіла адно: тое, што ўнучка, можна сказаць, дзіця асфальту і хмарачосаў, так хутка ўсё змяніцца: як падысці да казы, як пагладзіць, як падаіць...

А зрэшты, чаго дзівіцца: каранi ж яе тут, у вёсцы, у бабулі, якая спецыяльна пайшла на пенсію, каб набыцца з унучкай.

Таццяна Раманава,
г. Наваполацк.

ПАРТРЭТ

У той працоўны кабінет я прыйшоў у 1978 годзе. Пакой як пакой быў — нічога незвычайнага... Ну хіба што партрэт Карла Маркса, які больш нагадваў фотаздымак, зроблены яшчэ пры жыцці класіка марксізму-ленінізму.

А зрэшты, хто на яго звважаў: штось вісела на сцяне і вісела. Але ж неяк у наш кабінет завітаў прадстаўнік райкама партыі — азірнуўся і досыць строга заўважыў, што класік не столькі ўпрыгожвае сцяну, колькі абражае — і вялікага чалавека, і нават саму партыйную ідэю.

З гэтым — як з агнём — жартаваць не выпадала: мы вырашылі зняць «здымак» Карла Маркса і замест яго павесіць нешта сучаснае.

Ім, гэтым самым сучасным, быў тады Брэжнеў. Мой шэф спецыяльна схадзіў у кнігарню і там за свае ўласныя грошы набыў адпаведны партрэт. Мы змясцілі яго за шкло ў рамачцы і, магчыма, забыліся б, але ж дзе там: не прайшло і паўгода, як дарагі Леанід Ільіч нас пакінуў, а яго пасаду заняў Юрый Андропаў.

Што заставалася нашаму шэфу? Правільна: яшчэ раз схадзіць у кнігарню і выбраць новы партрэт.

Людзі больш сталага веку, напэўна, памятаюць, колькі пакіраваў Андропаў. А таму ў хуткім часе яго выяву мы таксама знялі: шэф зноў раскашэліўся — купіў партрэт Канстанціна Чарненкі...

Партрэт Гарбачова мы вешаць не сталі:

— Усё, хопіць, — сказаў мой шэф. — За апошні час я і так занадта патраціўся...

Але ж, з іншага боку, рамка ў нас была...

І таму ўрэшце мы змясцілі туды, як здавалася, вечнае: фотаздымак Леніна, які чытае газету «Правда».

Ён правісеў да 1991 года...

Мне цікава, дзе яны цяпер, гэтыя партрэты (раскупленыя і не)? Цікава, куды адыходзіць тое, што часам здаецца вечным?

Анатоль Палынскі,
г. Беразіно.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.
dounar@zviazda.by

Ад яе ж напамін: *сёлета «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў «Звязды» не проста друкуюцца, — яны да таго ж удзельнічаюць у конкурсе на самую-самую — смешную, цікавую, разумную...*

Хто і калі іх вызначыць? Мы з вамі. Прычым «працэс» ужо ідзе. Гэта значыць, што працуе як маленькае рэдакцыйнае журы (у складзе першага намесніка галоўнага рэдактара Наталлі Карпенкі, рэдактара аддзела Надзеі Дрылы і спецыяльнага карэспандэнта Яраслава Лыскаўца), так і вялікае чытацкае з усіх ахвотных пад старшынствам даўняй падпісчыцы газеты і вядомай гумарысткі Соф'і Кусянковай з вёскі Лучын, што на Рагачоўшчыне.

Вы хацелі б далучыцца? Без праблем: калі да каманды апавядальнікаў, то проста пішыце — дасылайце свае «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі», калі да складу журы, — то чытайце ўжо напісанае і надрукаванае (падшыўку газеты можна знайсці ў бібліятэках або ў інтэрнэце), ацэньвайце па пяцібальнай сістэме з пазнакай даты апублікавання і складвайце ў нейкую шуфлядку. У канцы года нам застанецца «падняць» ды перагледзець свае запісы (нешта, магчыма, перачытаць) і назваць сваю дзясятку найлепшых твораў. Аўтараў іх чакаюць сюрпрызы. А магчыма, і прызы. Пішыце. Свет захаваўся таму, што смяяўся. І думаў.

Краіна здароўя

Выпуск №12 (365)

■ Мудрае рашэнне

А СЭРЦАЙКА СТУКАЕ

Новая для краіны практыка правядзення перадабортнага кансультавання ў апошнія гады дазваляе прыкладна 20 працэнтам цяжарных жанчын адмяніць паспешлівае рашэнне і ўсё ж нарадзіць.

Фота Анжэлы ФАМЯНКОВАЙ.

Той выпадак, калі лепш сем разоў адмераць

Пераможцы рэспубліканскага конкурсу «За жыццё» падзяліліся нядаўна з іншымі калегамі асаблівасцямі правядзення нялёгкай работы. Лепшы вопыт складзе аснову сістэмы ажыццяўлення перадабортнага кансультавання ва ўсёй краіне, што прадугледжана адпаведным раздзелам праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека». «У нашай краіне, нягледзячы на няпростую сацыяльна-эканамічную сітуацыю, ніводная дапамога, звязаная з выплатамі па цяжарнасці, нараджэнні дзяцей, забеспячэнні лекамі не тое што не зніжана, а нават пашыраны пералік па некаторых пазіцыях, — адзначае **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Алена БОГДАН.** — А з 2017 года плануецца ажыццяўляць дзяржаўную падтрымку дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій. Усё гэта робіцца для таго, каб як мага больш сем'яў маглі мець і выхоўваць дзяцей».

Сучаснай сям'і наогул даводзіцца сёння нялёгка. Супраць яе, традыцыйнай — з зарэгістраванымі адносінамі, вялікай колькасцю дзяцей — шмат выклікаў сучаснасці: грамадзянскі шлюб (а правільней сказаць, сужыццё), выпадкі бясплоднасці, арыентацыя на сям'ю з адным дзіцем, адкладанне нараджэння першынца на больш позні тэрмін, пашырэнне практыкі аднаполых шлюбаў... Тыя ж аборты забараняць, зразумела, ніхто не збіраецца — такая практыка прыводзіць толькі да росту крымінальных аперацый і рызыкі гібелі жанчыны, а Беларусь якраз толькі дасягнула самай нізкай у свеце мацярынскай смяротнасці. Аднак кідаць справу на самацёк таксама немагчыма. Асноўнымі захадамі ў галіне папярэджвання непажаданай цяжарнасці і абортаў сталі перадабортнае кансультаванне, дадзеная ўрачу магчымасць адмовіцца ад выканання аборту, а два гады таму быў скарочаны і пералік сацыяльных паказанняў для перарывання цяжарнасці — у ім засталіся толькі згвалтаванне і пазбаўленне бацькоўскіх правоў. Гэта прывяло да таго, што колькасць перарыванняў цяжарнасці па сацыяльных паказаннях скарацілася фактычна ў дзесяць разоў (летась зарэгістравана 44 выпадкі, а было каля 400).

Паводле слоў **загадчыцы жаночай кансультацыі №2 Гродзенскай цэнтральнай гарадской паліклінікі Святланы КУПРАШЭВІЧ**, для аказання комплекснай дапамогі жанчыне ў снежні 2015 года быў афіцыйна адкрыты кабінет «За нараджэнне». Спецыялісты працавалі з больш як 180 пацыенткамі, з якіх 40 у выніку нарадзілі дзіця. Прыкладна такі расклад і ў іншых кансультацыйных кабінетах.

— Сярод прычын, па якіх жанчыны імкнуцца пазбавіцца цяжарнасці, часта называюцца матэрыяльна-бытавыя цяжкасці — нізкі даход, адсутнасць жылля, пражыванне з бацькамі, незакончаная вучоба, адсутнасць работы, — расказвае **загадчыца жаночай кансультацыі Полацкай цэнтральнай гарадской бальніцы Святлана ПРАКАПЕНКА.** — У такіх выпадках выяўляюцца праблемы сэнсу жыцця, міжасабовых стасункаў з мужам і старэйшымі дзецьмі, негатыўны вобраз будучыні: «Я не бачу сэнсу нараджаць яшчэ», «Мне і з адным цяжка, стамляюся», «Хочацца і для сябе пажыць, свет паглядзець». Побач з жанчынай аказваюцца блізкія, якія не толькі не падтрымліваюць, а дазваляюць перарваць цяжарнасць. Мужчыны ў лепшым выпадку кажуць: як ты вырашыш, так і будзе. Наогул мужчынам патрабуецца больш часу для ўсведамлення сітуацыі, аднак праблема ва ўзаемаадносінах

Работа скіраваная на тое, каб жанчына атрымала магчымасць адшукаць у сабе тыя рэсурсы, якія дапамогуць прыняць мудрае рашэнне, а яно, вядома, у тым, каб захаваць жыццё...

навідавоку...

Каб скіраваць жанчыну на іншыя развагі, псіхолагі ідуць на хітрасць — прапануюць нарадзіць і... пакінуць у радзільні. Зразумела, сто працэнтаў цяжарных заяўляюць: я не кіну сваё дзіця. Не кіне, але... заб'е? З аднаго боку пацыенткам прадастаўляецца інфармацыя аб тым, што такое аборт, а з другога, яны слухаюць расказы пра тое, што і як адбываецца з плодам — вось дзіця смокча пальчык, цяпер у яго ўжо б'ецца сэрцайка, плод адчувае боль...

— У глыбіні душы любая жанчына разумее, што аборт — гэта дрэнна, — кажа **псіхолаг Барысаўскага радзільнага дома Кацярына РУСАНАВА.** — Аднак ні ў якім разе нельга даць ёй зразумець, што яна робіць дрэнна і няправільна. Жанчына, якая ўпершыню перарывае цяжарнасць, не думае пра дзіця як пра асобу. Таму падчас кансультацый неабходна засяродзіць на гэтым увагу: ёсць спецыяльныя макеты з выявай дзіцяці, наглядныя сродкі, якія дапамогуць падумаць пра дзіця як пра чалавека. Але гэта не ціск на жанчыну. Гэта не для таго, каб жанчына прыняла рашэнне, правільнае з пункту гледжання ўрача. Работа скіраваная на тое, каб жанчына атрымала магчымасць адшукаць у сабе тыя рэсурсы, якія дапамогуць прыняць мудрае рашэнне, а яно, вядома, у тым, каб захаваць жыццё...

Мяркуючы па апытаннях, значная доля пацыентак не адмаўляецца ад нараджэння наогул — даволі значная колькасць разважае прыкладна так: «Можа, пазней, але не цяпер». Заўважана, што нават калі жанчына пасля перадабортнага кансультавання ўсё роўна прымае рашэнне пазбавіцца цяжарнасці, практыка сведчыць, што верагоднасць паўтарэння сітуацыі ў будучыні зніжаецца.

Даследаванні паказваюць, што на аборт часцей за ўсё ідуць не маладыя незамужнія, а наадварот, замужнія, дарослыя, якія ўжо маюць адно-дваіх дзяцей. Наогул для правядзення падобнай работы няма адзінага рэцэпта, але самым важным з'яўляецца, як кажуць псіхолагі, разгойданне на пазітыў. Жанчына можа ісці на аборт толькі таму, што ёй ужо 40, адно дзіця ўжо ёсць... Фактычна ёй хацелася б, каб нехта аўтарытэтны, кшталту доктара, проста пазбавіў яе комплексу «Я надта старая, каб нараджаць». Усяго крыху падтрымкі, і праз дзевяць месяцаў у кабінеце ўрача плачуць ад шчасця і сама матуля, і «малады» тата. Або вось іншая сітуацыя. Непаўналетняя дзяўчынка жадае пакінуць цяжарнасць, а яе бацька, які адзін выхоўвае дачку — катэгарычна і нават агрэсіўна супраць. Але ўсяго адна кароткая гутарка са святаром, і цяпер гэта — шчаслівы дзядуля ■

ХВАРОБЫ БУДУЧЫХ МАМ

З развіццём службы дзіцячай гінекалогіі ахоп падлеткаў медаглядамі вырас з 65% у 2007-м да 99,2 у 2012-м і летась склаў 99,7%, паведамляе галоўны пазаштатны дзіцячы акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Аксана КУДЗІНА.

Гінекалагічная захворванасць дзяўчат-падлеткаў няўхільна расце. У структуры гінекалагічнай захворванасці дзяўчат ва ўзросце 0-18 гадоў 85 працэнтаў складаюць хваробы мочапалавой сістэмы, 8 працэнтаў — парушэнні менструальнага цыкла, 4 працэнты — запаленчыя інфекцыйныя захворванні і паталогія шыйкі маткі, 2 працэнты — траўмы, 1 працэнт — эндакрынная паталогія, 0,3 працэнта — новаўтварэнні.

Найбольшая колькасць абортаў прыпадае на ўзроставую групу 20—29 гадоў, а ва ўзроставай групе да 18 гадоў рэгіструецца ў сярэднім 1,2-1,9 выпадкі на тысячу дзяўчат. Колькасць абортаў у 15-17-гадовых зніжалася ў апошнія гады.

Вакуум-аспірацыі летась былі праведзены ў 18% выпадкаў. У 70% выпадкаў цяжарнасць перарывалася да 12 тыдняў, да 21 тыдня — у 12% выпадкаў, па генетычных паказаннях — у 5%. Колькасць медыкаментозных абортаў складае ў цэлым не больш за 7 працэнтаў, але тут трэба ўлічваць, што яны праводзяцца платна, а меддапамога тым жа непаўналетнім аказваецца толькі на бюджэтнай аснове.

■ Доктар адкажа

ШТО З ПЕЧАННЮ?

«Раскажыце, калі ласка, што азначаюць дыфузныя змены ў печані і падстраўнікавай залозе?

Кацярына Аляксеёўна, *г. Мінск».*

Тлумачыць **участковы тэрапеўт 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Галіна ШАМАНСКАЯ**:

— Гепатозы — гэта група захворванняў печані, у аснове якіх хаваецца парушэнне абмену рэчываў у пячоначных клетках, развіццё ў іх дыстрафічных змяненняў. Пры гэтым запаленчых з'яў можа не быць наогул або яны слаба праяўляюцца. Развіццё гепатозаў звязваюць з цэлым шэрагам прычын. Ім могуць спрыяць іншыя захворванні — шчытападобнай залозы, цукровы дыябет, атлусценне, сіндром Кушынга, дэфіцыт бялку, авітамінозы... А яшчэ парушэнні абмену білірубіну і жоўцевых кіслот у печані.

Самым распаўсюджаным гепатозам з'яўляецца хранічны стэатагепатоз. Гэта захворванне суправаджаецца атлусценнем пячоначных клетак. Прычыны атлусцення клетак печані — часцей за ўсё, празмернае паступленне тлушчаў і вугляводаў з ежай або іх лішак у крыві, што абумоўлена рознымі парушэннямі абмену рэчываў, метабалічным сіндромам, эндакрыннымі захворваннямі, уздзеяннем таксічных для печані рэчываў, у тым ліку алкаголем і некаторымі лекамі. Магчыма развіццё такой паталогіі і праз парушэнне вывядзення тлушчу з печані. Гэта адбываецца пры зніжэнні колькасці рэчываў, якія ўдзельнічаюць у перапрацоўцы тлушчаў, парушэнні ўтварэння з тлушчаў фосфаліпідаў, бэта-ліпапратэінаў, лецыціну, у выніку чаго «лішні» свабодны тлушч адкладваецца ў пячоначных клетках.

Падчас ультрагукавой дыягностыкі назіраецца раўнамернае павелічэнне печані, дыфузнае павышэнне яе эхагеннасці з захаваннем яе адналоднасці (хоць калі працэс будзе прагрэсаваць, то з'явіцца характэрная «зярністасць» парэнхімы, якая сведчыць аб пачатку развіцця стэатагепатыту і гепатыту).

Калі выстаўляецца дыягназ «гепатоз печані», то трэба разумець, што спецыфічнага лячэння не існуе. Стратэгія пазбаўлення гепатозу будзе зводзіцца да некалькіх момантаў: выдаленне фактараў, якія могуць выклікаць дыстрафію печані, паляпшэнне рэгенерацыі печані, карэкцыя метабалізму і дэтаксікацыя печані. Лячэнне заўсёды строга індывідуальнае. Акрамя медыкаментознай тэрапіі, урач рэкамендуе правільны рэжым харчавання.

Дыфузныя змены падстраўнікавай залозы — гэта не дыягназ, а заключэнне ўрача інструментальнай дыягностыкі. Гэта сімптом, які часцей за ўсё з'яўляецца прыкметай вострага або хранічнага панкрэатыту. Дыфузныя змены могуць быць рознымі, у залежнасці ад стадыі паталагічнага працэсу. Пры вострым панкрэатыце на УГД назіраецца павелічэнне памераў органа, зніжэнне яго эхагеннасці. Пры хранічным панкрэатыце зніжэнне шчыльнасці вызначаецца без змянення контураў органа. Калі ж эхагеннасць павышаная, такія дыфузныя змены падстраўнікавай залозы часцей за ўсё сведчаць аб перанесеным запаленчым працэсе. Таксама яны могуць узнікаць з іншых прычын: пажылы ўзрост, перанесеныя аперацыі, парушэнне кровазабеспячэння парэнхімы органа, цукровы дыябет, мукавісцыдоз і інш. Каб прыняць рашэнне аб неабходнасці лячэння, спачатку трэба ўстанавіць прычыну дыфузных змен, улічваючы анамнез, скаргі пацыента і вынікі дадатковых метадаў абследавання.

■ Псіхалогія для ўсіх

ВЫШЭЙШАЯ ПАСАДА — БОЛЬШЫ СТРЭС

Прыкладам могуць служыць цікавыя даныя адной англійскай кампаніі, якая валодае 14 тысячамі аўтамабіляў і здае іх у пракат розным установам у якасці службовага аўтапарка. Статыстыка паказвае, што частата аварый, у якія трапляюць гэтыя машыны, наўпрост звязана са службовым становішчам чалавека, які сядзіць за рулём.



У дырэктараў і старшага кіраўніцкага звяна кампаній-карыстальніц аўто аварыі адбываліся прыблізна кожныя 15 000 км, у кіраўнікоў аддзелаў продажу — кожныя 17 600 км, у асоб, якія непасрэдна займаліся продажам, — кожныя 20 000 км, у кіраўнікоў сярэдняга звяна, якія працуюць у асноўным у офісе, — кожныя 23 000. Пры гэтым кошт рамонту пасля аварыі, у якую трапіў дырэктар, амаль удвая большы за страты, атрыманыя супрацоўнікамі ніжэйшага рангу. Прадстаўнікі кампаніі, якая валодае машынамі, растлумачылі гэта душэўнай неўраўнаважанасцю, уласцівай кіраўнікам у большай ступені, чым падначаленым.

— З гэтым назіраннем можна пагадзіцца, — тлумачыць **намеснік галоўнага ўрача па памежнай псіхіятрыі Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Наталля БЕРАЗОЎСКАЯ.** — Існуе нават паняцце «стрэсу кіраўніка», і абумоўлены гэты стрэс адказнасцю за вырашэнне разнастайных задач, кожная з якіх можа разглядацца як асобны стрэсагенны фактар.

Што гэта за задачы?

Урэгуляванне стасункаў з партнёрамі і канкурэнтамі, афіцыйнымі структурамі, падатковымі органамі.

Пастаноўка стратэгічных і тактычных мэт для арганізацыі, пошук аптымальных спосабаў іх дасягнення, улік магчымых рызык, хоць насамрэч у самім слове «рызыка» закладзена немагчымасць прадбачыць і спрагназаваць абсалютна ўсё.

Неабходнасць прымаць нестандартныя рашэнні, хутка засяроджвацца і пераключаць увагу.

Работа ў рэжыме чакання, няпэўнасці, дэфіцыту ці лішку інфармацыі.

Неабходнасць вырашэння стратэгічных задач, вынікі якіх часта адтэрмінаваныя (у псіхалогіі вядома, што атрыманне канкрэтнага выніку з'яўляецца важным фактарам задаволенасці работніка сваёй працай).

Стасункі з мноствам людзей, якіх неабходна рознымі спосабамі стымуляваць да эфектыўнай працы.

Неабходнасць прымаць непапулярныя меры (пакаранні, звальненні).

Усё гэта стварае празмернае нервова-псіхічнае напружанне (у перакладзе з англ. «стрэс» — напружанне), што прыводзіць да шэрагу непрыемных псіхалагічных і фізічных сімптомаў.

Арганізм чалавека — сістэма мудрая, здольная да самааднаўлення, але важна прыслухоўвацца да сябе, сваіх патрэб, распазнаваць сігналы аб дыскамфорце. У кожнага чалавека існуе свой любімы антыстрэсавы набор прыёмаў для цела і душы. Гэта можа быць:

— гарачы шакалад, пушысты плед, зручнае крэсла і любімая кніжка;

— добрае віно і палкі партнёр;

— кароткачасовы водпуск у цёплых краях у адзіноце ці ў прыемнай кампаніі;

— сон — столькі, колькі хочацца, і яшчэ крыху;

— заняткі спортам;

— лазня — з парылкай, венікам і скоканнем у сумёт;

— стасункі з прыродай: лес, поле, агарод, кошкі, сабакі, коні;

— людзі — якім вы патрэбны, якія вас цэняць, любяць, падтрымліваюць і весяляць.

А вось прыём моцнага алкаголю, кавы і розных лекавых прэпаратаў мае сур'ёзныя недахопы, бо спрыяе затрымцы працэсу натуральнай самарэгуляцыі эмацыянальных рэакцый, фарміраванню залежнасці, зніжэнню інтэлектуальных магчымасцяў, а таксама стварае дадатковыя праблемы (напрыклад, страта сацыяльнага кантролю, як у выпадку з алкаголем).

На жаль, не існуе чароўнай пілюлі ад стрэсу. Самае важнае — жаданне і гатоўнасць рабіць штосьці для сябе. Без уласнай актыўнай пазіцыі не абысціся. Псіхолаг або псіхатэрапеўт могуць толькі дапамагчы авалодаць некаторымі карыснымі навыкамі.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Дзеці ў бяспецы

НАВОШТА ПАТРЭБНЫ ВАКЦЫНЫ?

Імунная сістэма здольная абараніць дзіця ад антыгенаў і мікраарганізмаў, якія пастаянна з намі — банальнай кішэчнай палачкі, стрэптакокаў, але яна бяссільная перад узбуджальнікамі дыфтэрыі, віруснага гепатыту В, слупняку, коклюшу... І тут на дапамогу прыходзяць вакцыны. Яны «знаёмяць» арганізм з узбуджальнікамі інфекцый і «навучаюць» метадам барацьбы.

Большасць прышчэпак, атрыманых у дзяцінстве, стварае аснову імунітэту на ўсё жыццё. Дзеянне некаторых прышчэпак з цягам часу слабее, а таму вакцынацыю паўтараюць.

Паводле слоў **медыцынскай сястры 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Галіны РАКОЎСКАЙ,** у некаторых дзяцей пасля прышчэпкі можа быць і павышэнне тэмпературы, і пачырваненне або ўшчыльненне ў месцы ўвядзення вакцыны, але гэта заканамерная рэакцыя, яна кароткачасовая і не патрабуе лячэння. Верагоднасць развіцця ўскладненняў пасля перанесенага інфекцыйнага захворвання ў тысячы разоў большая за рызыку ўзнікнення ўскладнення пасля прышчэпкі.

✓ Прышчэпкі не праводзяць у час абвастрэння хранічнага захворвання. Праўда, калі рызыка заражэння надта высокая (пасля кантакту з хворым), шэраг вакцын можна ўвесці на фоне нязначных сімптомаў.

✓ Дзецям, якія часта хварэюць або маюць хранічныя захворванні, прышчэпкі неабходны ў першую чаргу — інфекцыі ў іх працякаюць значна цяжэй і нярэдка з ускладненнямі.

✓ Дзецям з хранічнымі захворваннямі пажадана стварыць дадатковую абарону з дапамогай прышчэпак ад пнеўмакокавай і менінгакокавай інфекцый, хіб-інфекцыі (выклікае гемафільная палачка), віруснага гепатыту А.

У кожнай краіне існуе свой нацыянальны каляндар прышчэпак, які ўлічвае эпідэмічную сітуацыю ў канкрэтным рэгіёне. У Мінску дзецям дадаткова праводзіцца імунізацыя супраць віруснага гепатыту А і з 2007 года — супраць хіб-інфекцыі.

Імунная сістэма шматфункцыянальная і здольна апрацоўваць некалькі задач адначасова, таму правядзенне некалькіх прышчэпак у адзін дзень дазваляецца.

Ці можа захварэць прышчэпленае дзіця?

Ніводная вакцына не дае 100% гарантыі, што дзіця не захварэе, аднак гэта бывае вельмі рэдка. Калі прышчэпленае дзіця ўсё ж такі захварэе, то ў лёгкай форме, без ускладненняў, а галоўнае, не загіне.

Непрышчэпленае дзіця будзе мець шэраг абмежаванняў пры наведванні калектыву, таму што мае высокую рызыку захварэць і стаць крыніцай інфекцыі для іншых дзяцей. Калі дзіцяці не праведзена прышчэпка без прычыны, то такая сітуацыя расцэньваецца як парушэнне правоў дзіцяці на здароўе і жыццё.

■ Першая дапамога

ЯК БУДЗЕМ РАТАВАЦЦА...

Вазьміце на ўзбраенне парады, як правільна дапамагчы сабе адразу пасля таго, як вас напаткала непрыемнасць.

...пры апёку

— Кожны від апёку, а ён бывае тэрмічны, хімічны, электрычны, прамянёвы, светлавы, мае свае асаблівасці, аднак асноўныя моманты іх лячэння аднолькавыя, — нагадвае **ўрач-траўматолаг 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Дзмітрый АЎХІМОВІЧ.** — Самастойна можна лячыць толькі сонечныя апёкі 1 ступені, якія праяўляюцца пачырваненнем скуры без пухіроў. Апрацуйце скуру растворам антысептыку (ёдыскін, фурацылін) або пантэнолам.

Самае важнае ва ўсіх выпадках — ніякіх спіртавых растворaў і ніякай ваты! Прыкладайце праз тканіну холад па 5-10 хвілін цягам некалькіх гадзін. Абавязкова трэба паказацца траўматолагу або камбустыёлагу (урач, які займаецца лячэннем апёкаў), які ацэніць глыбіню і плошчу пашкоджання. Няправільнае самалячэнне прывядзіць да паглыблення апёкавай раны, павышае рызыкі інфіцыравання, ускладненняў.

...пры парэзах

Драпіны-парэзы — гэта калі пашкоджана толькі скура, капілярны крывацёк спыняецца праз некалькі хвілін пасля націскання. Апрацуйце парэз антысептыкам (перакіс вадароду, фурацылін, хлоргексідын, ёдыскін). Перакіс вадароду прымяняецца толькі для першаснай апрацоўкі ран, але не для паўсядзённых перавязак! Ачысціце ад забруджванняў, пакладзіце сурвэтку, змочаную антысептыкам, зафіксуйце бінтам. Невялікія парэзы пасля з'яўлення фіксаванага струпа (праз 2-3 дні) трэба лячыць адкрыта, без павязак, апрацоўваючы растворам антысептыку, можна ўжо і спіртавым. Пазбягайце намакання да поўнага загойвання — 8-10 дзён.

...пры вялікіх ранах

Глыбокія і вялікія раны (з моцным пашкоджаннем тканак і моцным крывацёкам) неабходна апрацаваць гэтак жа, як і парэз. Накласці сціскальную павязку. Калі крывацёк артэрыяльны (пульсуючы струмень чырвонай крыві), на канечнасць накладваецца жгут — на ўзроўні ніжняй трэці сцягна або пляча. На перадплечча і галёнку артэрыяльны жгут не накладваецца! Накладваць можна на тканіну або віток на віток. Замацоўваецца пад жгут і запіска з указаннем часу накладвання (зімой гэта можа быць 2 гадзіны, а летам — 1,5). Пасля трэба паказацца траўматолагу або хірургу. Магчыма, рана запатрабуе хірургічнай апрацоўкі і ўшывання.

...пры ўкусах

Калі ўкусіла жывёла, рану трэба спачатку добра прамыць пад праточнай вадой з мылам цягам не менш як 15 хвілін. Далей пакладзіце сурвэткі з антысептыкам (ёдыскін, фурацылін, хлоргексідын, септамірын, мірамісцін або інш.) і абавязкова як мага хутчэй пакажыцеся ўрачу. Калі траўма здарылася ў непрацоўны для паліклінікі час, абавязкова пазваніце па нумары 103 і ўдакладніце, у якую з бальніц трэба звяртацца. Бо жывёла можа быць пераносчыкам шаленства, і адкрытая рана — гэта рызыка заражэння слупняком, а таму спатрэбіцца вакцынапрафілактыка. Наогул раны пасля ўкусаў лечацца ў аддзяленнях гнойнай хірургіі.

ЕВРОТОРГ ИНВЕСТБАНК

ОАО «Евроторгинвестбанк»
www.etib.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2016 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 01.07.2016 г.	На 01.07.2015 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		34 132	38 729
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		66 968	47 486
5	Средства в банках	1104		149 633	66 735
6	Ценные бумаги	1105		70 910	10
7	Кредиты клиентам	1106		534 210	464 335
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		23 491	20 418
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		-	-
12	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
13	Прочие активы	1112		4 222	134 719
14	**ИТОГО активы**	**11**		**883 566**	**772 432**
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		-	-
17	Средства банков	1202		138 386	186 800
18	Средства клиентов	1203		165 643	136 048
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		70 377	41
20	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
22	Прочие обязательства	1207		8 594	5 078
23	ВСЕГО обязательства	120		383 000	327 967
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		430 000	414 924
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		24 769	4 664
28	Фонд переоценки статей баланса	1214		2 009	2 071
29	Накопленная прибыль	1215		43 788	22 806
30	ВСЕГО капитал	121		500 566	444 465
31	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**883 566**	**772 432**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2016 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 01.07.2016 г.	На 01.07.2015 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		109 647	76 702
2	Процентные расходы	2012		18 258	22 584
3	Чистые процентные доходы	201		91 389	54 118
4	Комиссионные доходы	2021		9 136	15 864
5	Комиссионные расходы	2022		1 992	1 277
6	Чистые комиссионные доходы	202		7 144	14 587
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		1 405	(9)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		17 124	25 053
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		508	(2 136)
11	Чистые отчисления в резервы	207		25 477	35 779
12	Прочие доходы	208		10 549	6 684
13	Операционные расходы	209		58 534	42 445
14	Прочие расходы	210		1 680	3 466
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		42 428	16 607
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		9 155	4 254
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**		**33 273**	**12 353**

Председатель Правления В.А. Драгун

И.о. главного бухгалтера С.Л. Силицкая

Дата подписания 11 июля 2016 г.

Лицензия ОАО «Евроторгинвестбанк» № 26 от 28.05.2013 г. УНП 807000043.

ОАО «Минскоблхлебопродукт»

извещает, что 5 августа 2016 года состоится внеочередное собрание акционеров года по адресу: г. Минск, пер. Физкультурный, 34 (УП «ОМЗ «Агротехконмаш»). Начало собрания в 12.00. Регистрация акционеров с 11 часов. При себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера паспорт и доверенность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

О внесении изменений и дополнений в «Положение о порядке купли-продажи жилых домов (квартир), находящихся в собственности ОАО «Минскоблхлебопродукт».

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт».
Тел. 220 59 17.

УНП 600013173

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 09 августа 2016 года повторных торгов по продаже конфискованного имущества

Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества)	**Единый объект недвижимого имущества в составе недвижимого улучшения клуба №610/С-24911, общ. пл 918,8 кв. м, условный земельный участок пл. 0,1159 га, расположенный по адресу: г. Борисов, ул. Генерала Толстикова, 2**
Начальная цена	73 880,05 белорусских рублей (738 800 500 белорусских рублей образца 2000 года)
Сумма задатка	7 300 белорусских рублей (73 000 000 белорусских рублей образца 2000 года)
Организатор аукциона	Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-05-62

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

